СОНЦА:
Усход, захад, даўжыня дня:
Мінск — 5.21, 21.09, 15.48;
Віцебск — 5.06, 21.05, 15.59;
Магілёў — 5.11, 20.58, 15.47;
Гомель — 5.16, 20.47, 15.31;
Гродна — 5.39, 21.21, 15.42;
Брэст — 5.45, 21.17, 15.32.

МЕСЯЦ:
Маладзік 29 ліпеня.

ІМЯНІНЫ:
Серафіма, Рамана, Сцяпана, Макрыны;
Пятра, Юстына.

ЗВЯЗДА

ЖНІЎНЯ 1992 г.
субота, № 152 (21930)

● выдаецца са жніўня 1917 г. ● БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА ● цана 1 рубель

ВОЗГАЛАС

ПАДЫСЦІ І ПЕРАКЛЮЧЫЦЬ КАНАЛ

Жыхары рэспублікі, прачнуўшыся сёння, мабыць, здзівіліся, што тэлевізійны канал БТ «перасяліўся» на І канал, на якім яшчэ ўчора вяшчалася праграма «Астанкіна», якая, у сваю чаргу, перайшла на БТ.

Што гэта — чарговы сюрпрыз тэлевізійшчыкаў ці змены ў лепшы бок на нашым блакітным экране?

Вось што паведаміў пра тэлеперабудову намеснік міністра інфармацыі Рэспублікі Беларусь Іван КАРЭНДА.

— Справа ў тым, што да сённяшняга дня праграма першага тэлеканала «Астанкіна» ахоплівала 98 працэнтаў нашай тэрыторыі, у той час як вяшчанне Беларускага тэлебачання распаўсюджвалася на 94 працэнты Беларусі. Цяпер, адпаведна, гэтыя паказчыкі «памяняюцца» месцамі.

Да таго ж,— працягвае Іван Арсенцьевіч,— астанкінскую праграму забяспечвалі больш магутныя перадатчыкі, якія будуць цяпер «працаваць» на нашу тэрыторыю.

— А ці не хвалюе вас тая акалічнасць, што многія жыхары рэспублікі выказуць незадавальненне такімі зменамі?

— Не думаю,— кажа Карэнда,— хіба цяжка падысці да тэлерыёмніка і пераключыць канал. Дарэчы, ад саміх гледачоў ужо было шмат такіх прапаноў у наш адрас. Таму пытанне гэтае ў нас на парадку дня стаяла ўжо даўно. Мы ўнеслі адпаведную прапанову ў Савет Міністраў, на што ўрад рэспублікі даў згоду і даручыў ажыццявіць наш план ужо з 1 жніўня.

—Акрамя «лішніх» 4 працэнтаў тэлевяшчання ці ёсць яшчэ што дадатковае ў гэтых зменах?

— Безумоўна,— заключае намеснік міністра.— Такое пераключэнне дазволіць глядзець праграму БТ нашым землякам, якія пражываюць на Віленшчыне, і нават у некаторых рэгіёнах Польшчы, напрыклад, на Беласточчыне. Таму, думаю, яны будуць вельмі задаволены, што змогуць і за мяжой сачыць за падзеямі, якія адбываюцца на Беларусі.

Як бачым, перабудова на ТБ рэспублікі значная. І, здаецца, не бяссэнсавая. Адной куляй забіваем адразу некалькіх зайцоў: дапамагаем нашым беларусам-эмігрантам, пашыраем геаграфію вяшчання і ўзмацняем хвалі айчыннага тэлеэфіру. Застаецца толькі пачакаць крыху і пераканацца ў гэтым асабіста.

Уладзімір ЗДАНОВІЧ.

АКАДЭМІЯ НАБІРАЕ СЛУХАЧОЎ

Распараджэннем урада вызначана колькасць набору слухачоў у Акадэмію кіравання пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь на 1992-93 навучальны год. Усяго сёлета сядуць «за парты» 225 чалавек, якія будуць авалодваць спецыяльнасцямі «дзяржаўнае кіраванне», «арганізацыя і кіраванне знешнеэканамічнай дзейнасцю», «эканоміка і кіраванне вытворчасцю». З набраных 75 чалавек будуць вучыцца на дзённым аддзяленні, а 150 — на завочным. Падрыхтоўку кадраў вырашана ажыццяўляць на аснове дагавораў, дзе абумоўліваюцца абавязацельствы як арганізацыі, што накіравала свайго работніка на вучобу, так і самога работніка і Акадэміі.

ФОРМА БУДЗЕ. ЦІ БУДЗЕ ЗМЕСТ?

Урадам рэспублікі прынята пастанова «Аб забеспячэнні работнікаў мытнай службы рэспублікі форменным і спецыяльным адзеннем і абуткам». Ёю зацверджаны варыянты зімовай і летняй формы, прадстаўленыя Дзяржаўным мытным камітэтам, а таксама табель прадметаў і нормы выдачы. Вызначана дата забеспячэння мытнікаў форменным і спецыяльным адзеннем і абуткам — да 1 лістапада 1992 года.

Служба інфармацыі Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.

СІТУАЦЫЯ СКЛАДАНАЯ, АЛЕ ЎРАД ПРЫКЛАДАЕ ЎСЕ НАМАГАННІ, КАБ ТРЫМАЦЬ ЯЕ ПАД КАНТРОЛЕМ

ВОСЬ ТАК ТЭЗІСНА МОЖНА СФАРМУЛЯВАЦЬ ЗМЕСТ ПРЭС-КАНФЕРЭНЦЫІ, ЯКАЯ АДБЫЛАСЯ Ў САВЕЦЕ МІНІСТРАЎ РЭСПУБЛІКІ.

Адкрыў яе ўступным словам М. Мясніковіч, першы намеснік Старшыні Саўміна. Пачаў ён з добрай навіны: становішча ў эканоміцы паступова большменш выпраўляецца. Сёння ўрад найперш непакоіць лёс ураджаю, увогуле працэсы, якія адбываюцца зараз у сельскай гаспадарцы. Вядома, моцная засуха зблытала карты ўсім, хто працуе на зямлі. Але памылкай было б спісваць на яе пралікі, што зараз дапускаюць арганізатары сельгасвытворчасці. Нямала старшынь і дырэктараў разгубіліся ў новых незвычайных для іх умовах, некаторыя зусім апусцілі рукі. Магчыма, ім не хапае ўпаўнаважаных райкомаў партыі, жорсткіх «разборак» на бюро?

Аднак, як канстатавалася на прэс-канферэнцыі, у многіх гаспадарках на абедзве нагі кульгае дысцыпліна, няма парадку, што перашкаджае сабраць без страт сёлетні сціплы ўраджай.

Тым не менш урад шукае шляхі, каб вырашчанае максімальна сабраць і захаваць. Нават калі гэта і ўдасца на 100 працэнтаў, усё роўна мы будзем зведваць востры недахват збожжа. Таму ўжо зараз урад вядзе перагаворы з Казахстанам аб пастаўцы нам двух мільёнаў тон збожжа. Вядома, дадуць яго нам не за прыгожыя вочы. Як адзначыў М. Мясніковіч, нашай рэспубліцы прыйдзецца за хлеб аддаць неабходную сабе прадукцыю, у нечым урэзаць свае запатрабаванні.

Для стабілізацыі абстаноўкі ў рэспубліцы вялікае значэнне маюць падпісаныя нядаўна ў Маскве дагаворы і пагадненні з Расіяй. Дасягненнем можна лічыць тое, што ўдалося дамовіцца аб пастаўках паліва ў патрэбнай для жыццезабеспячэння Беларусі колькасці. Ёсць дамоўленасць аб стварэнні разам з Расіяй холдзінгавай кампаніі па разведцы і здабычы нафты, пяці СП у гэтай галіне.

Расказаў М. Мясніковіч і аб тым, аб чым не ўдалося канчаткова і дакладна дамовіцца са «старэйшым» братам. Па ўзаемных разліках за пастаўленую прадукцыю Расія нам вінавата 48 млрд. рублёў, мы ёй — 41 мільярд. Лічбы не вельмі адрозніваюцца і, думаецца, з часам будзе знойдзены шлях вырашэння гэтай праблемы. Больш складана «вырваць» растранжыраную былым Знешэканомбанкам СССР валюту рэспублікі. У выніку яго банкруцтва замарожанымі аказаліся 350 мільёнаў нашых інвалютных рублёў, з якіх 172,5 мільёна долараў ЗША. Задача вярнуць рэспубліцы, яе прадпрыемствам, установам, арганізацыям і, як кажуць сёння, юрыдычным і фізічным асобам гэтыя «зялёненькія», якія былое кіраўніцтва Саюза так спрытна распусціла.

І зусім песімістычна намеснік прэм'ера рэспублікі быў настроены адносна падзелу былой уласнасці СССР за мяжой. Яна пачынала стварацца яшчэ царскай імперыяй, потым Саветы больш за 70 гадоў яе ўзбагачалі. Як тут знайсці крытэрыі падзелу? Па ўсім відаць, працэс зацягнецца на гады.

Зразумела, свая доля ў замежнай маёмасці для нашай маладой незалежнай рэспублікі была б вельмі дарэчы. Але яшчэ большую патрэбу Беларусь мае ў замежных інвестыцыях у эканоміку. Як тут справы? Зараз аформлены ўсе дакументы на атрыманне з ФРГ крэдытаў на 1 мільярд 200 тысяч марак. Цяпер ва ўрадавых установах, ведамствах і міністэрствах рэспублікі, паводле слоў М. Мясніковіча, ідзе напружаная работа, каб напоўніць гэту крэдытную лінію належнымі праектамі, каб найбольш эфектыўна выкарыстаць гэтыя сродкі, у прыватнасці, павялічыць свой экспарт. З Міжнародным валютным фондам і Сусветным банкам ёсць дамоўленасць аб выдзяленні нам, акрамя стабілізацыйнага фонду яшчэ 100 млн. долараў на рэформу эканомікі. З Італіяй таксама дамовіліся аб крэдытах на 100 мільёнаў долараў. Ёсць іншыя пагадненні на атрыманне салідных крэдытаў. Цяпер галоўнае з розумам імі распарадзіцца. Як мяркуе ўрад разлічвацца за іх? А так, каб 70 працэнтаў праектаў, якія будуць ажыццяўляцца за кошт крэдытаў, мелі валютную акупнасць.

У прэс-канферэнцыі таксама ўдзельнічалі міністр аховы рэсурсаў і экалогіі Рэспублікі Беларусь П. Казлоўскі, старшыня Дзяржкаммытні Беларусі Г. Шкурдзь. Кожны з іх паведаміў прысутных са станам спраў у падпарадкаваных ім ведамствах. У прыватнасці, Г. Шкурдзь паведаміў цікавыя даныя пра будні работнікаў мытні. За шэсць месяцаў г. г. праз нашы КПП у Польшчу выехала 2 мільёны 220 тысяч чалавек і крыху менш прыбыло з яе на нашу тэрыторыю. Зноў каля мытняў КПП з'явіліся чэргі, праўда, не такія доўгія, як раней. Даўно наспеў час адкрыць новыя КПП. Але, мякка кажучы, Польшча не праяўляе асаблівай цікавасці да гэтай справы. Яе прадстаўнікі чамусьці марудзяць, пастаянна знаходзяць усё новыя прычыны, якія ім быццам бы перашкаджаюць рабіць канкрэтныя крокі.

Падобную пазіцыю займаюць Латвія і Літва, якія таксама не гараць вялікім жаданнем устанавіць цывілізаваныя адносіны на граніцы.

А яны вельмі патрэбны. Расце колькасць кантрабанды. Назіраецца тэндэнцыя да вывазу буйных партый каляровых і рэдказямельных металаў, антыкварыяту, культурных каштоўнасцей. Днямі на КПП «Казловічы» затрымалі аўтамабіль, на якім спрабавалі вывезці тавараў на 4 мільёны рублёў. А ў поездзе на Берлін мытнікі знайшлі ў тайніку 80 тысяч долараў.

Г. Шкурдзь паведаміў аб змяненнях у правілах вывазу грошай і валюты. Цяпер грамадзянін будзе мець права ўзяць з сабой за мяжу 5 тысяч рублёў (без растраты іх там), 500 долараў ЗША і падарункаў і сувеніраў на 5 тысяч рублёў.

Леанід ЛАХМАНЕНКА.

Ці стане «Советская» «Свободной»

2 жніўня газета «Советская Белоруссия» адзначае свой юбілей. І хоць не на нашым, а на іх паверху заўтра свята, усё ж не хочацца застацца ў баку ад такой рэдкай у сённяшняй шэрасці дзён падзеі. Таму прапануем вам гутарку нашага карэспандэнта з галоўным рэдактарам «СБ» Юрыем ІВАНОВЫМ.

— Юрый Міхайлавіч, на 65-м годзе свайго жыцця ваша газета перажывае росквіт ці заняпад?

— У адрозненне ад усяго грамадства, неяк нават няёмка гэта ўсведамляць, мы, сапраўды, знаходзімся ў стане росквіту.

— Ну што ж, віншуем з гэтым. Але чым вы тлумачыце такую акалічнасць, што «СБ» мае сёння самы вялікі тыраж сярод перыядычных выданняў рэспублікі?

— Я лічу, справа ў тым, што заўсёды галоўнай лініяй нашай газеты была сацыяльная абароненасць людзей, мы лічылі неабходным узняцца да разумення штодзённых бытавых клопатаў чытача. Нават тое, што калгасніку не далі каня ці сена, было для нас праблемай. Газета магла абараніць простага чалавека ад партыйных босаў на ўзроўні гаркома ці райкома і абараняла.

А, па-другое, «Советская Белоруссия» — выданне, як бы сказаць, дзесьці кансерватыўнага складу. Мы не гонімся за модным палітычнымі плынямі і думкамі, мы ідзём за чытачом і разам з ім. Можа, таму людзі і выпісваюць нас па 40 —50 гадоў. Дарэчы, для сваіх старых чытачоў на гэты год мы захавалі ранейшы кошт падпіскі: 19 руб. 80 кап. —як самі жартуем, шклянка гарэлкі.

— Неяк так атрымалася, што з усіх сённяшніх выданняў назва вашай газеты выклікае найбольш нараканняў. Ці не збіраецеся вы яе змяніць?

— Ну, калі разабрацца, то Саветы ў нас яшчэ быццам бы існуюць... Ды і іншыя газеты, напрыклад, «Комсомольская правда», «Московский комсомолец», мяняць свае назвы не спяшаюцца.

Але пасля таго (каб не блытаць чытачоў), як скончыцца падпісная кампанія на 1993 год, назву мы ўсё ж зменім. Магчыма, «Советская» стане «Свободной»...

— Пасля мінулагодняй сітуацыі, калі існаванне амаль усіх выданняў было пад вялікім сумненнем, ці не зракліся вы на ўсё астатняе жыццё не імкнуцца да самастойнасці?

— Зусім не. Сёння мы вылічваем кошт падпіскі на 1993 год і мяркуем выйсці на самастойнае фінансаванне. Мы прапануем чытачу свой інфармацыйны тавар, за які запрошваем 210 рублёў на паўгода, і. калі ён здольны плаціць, будзем старацца, каб тавар адпавядаў цане.

Калі я была ўжо на парозе, у прыёмную патэлефанавала адна жанчына. Яна жадала перапічыць 65 рублёў на рахунак газеты да юбілею, але пошта грошы не прымала. Уся прыёмная ўгаворвала жанчыну лепш падпісацца на газету на гэтыя грошы, але ёй вельмі хацелася зрабіць падарунак. Так. «Советскую», сапраўды, ёсць з чым віншаваць, падумалася мне.

Гутарыла Вольга УЛЕВІЧ.

УРАДЖАЙ-92

У элітнай насенняводчай гаспадарцы «Гомельская» поўным ходам ідзе жніво. Як ні дзіўна, гарачыня садзейнічае якаснай уборцы. Справа ў тым, што збожжа, вырашчанае ў гаспадарцы, ідзе толькі як элітны пасадачны матэрыял і падсушка яго штучным спосабам выключаецца. Вось і стараюцца вадзіцелі ўсіх 11 камбайнаў, занятых на жніве, максімальна выкарыстаць спрыяльныя дні.

НА ЗДЫМКУ: вадзіцель Мікалай КРЫВЯНКОЎ аператыўна адвозіць зерне ад камбайнаў.

Фота Сяргея ХАЛАДЗІЛІНА, (БЕЛІНФАРМ).

А гаручае ёсць. І нямала.

МІНСК. 130 тысяч тон — такі запас гаручага ў рэспубліцы.

Як бачым, бензін ёсць. Амаль на 8 месяцаў. Але свае 80 літраў у ліпені змаглі атрымаць не ўсе аўтааматары. Улічваючы гэта, Саўмін прыняў рашэнне аб паквартальным водпуску бензіну.

Анатоль КУЛЯШОЎ.

Высокі госць са Швейцарыі

Як стала вядома карэспандэнту БЕЛІНФАРМа з добра інфармаваных крыніц, 4 жніўня чакаецца прыбыццё ў Мінск старшыні Нацыянальнага савета Швейцарскай Канфедэрацыі Ханса-Рудольфа Небікера. Прадугледжваецца, што высокі госць сустрэнецца з кіраўнікамі Вярхоўнага Савета Беларусі, пабывае ў Мінсельгаспрадзе рэспублікі, на прадпрыемствах аграпрамысловага комплексу. Магчыма, старшыня Нацыянальнага савета сустрэнецца з кіраўніком беларускага парламента Станіславам Шушкевічам, які цяпер правядзіць свой водпуск на тэрыторыі рэспублікі.

Прыблудзіліся вагоны з ртуццю

БРАГІН. Была ноч, калі на чыгуначную станцыю Ёлча (а ў гэты час начальніка яе не было і яна працавала ў аўтаматычным рэжыме) неўстаноўлены лакаматыў даставіў два вагоны са 130 тонамі ртуці і тут жа таямніча знік.

Таму вагоны перамясцілі на станцыю Перасадачная, што за тры кіламетры ад Ёлчы. Але сталкі ваенізаванай аховы адмовіліся іх вартаваць, таму дзяжурства каля вагонаў наладзілі работнікі міліцыі. Цікава, хто гаспадар гэтага грузу, які каля паўгода прастаяў на станцыі Кіеў—Дняпроўск суседняй Украіны і быў «падораны» сястрыцы Беларусі?

У. ПЕРНІКАЎ.

АКТУАЛЬНА!

У РЭСПУБЛІЦЫ ПА НАШАЙ ВІНЕ ПАЛАЮЦЬ ЛЯСНЫЯ ПАЖАРЫ

Ну, хто там з нас не гатовы прысягнуць на вернасць зялёнаму сябру! І ўвогуле, хто скажа, што яму, напрыклад, на экалогію напляваць! Ну, вядома ж, толькі так: «Лес—гэта наша багацце», «Лес—гэта лёгкія планеты». І г. д. Нездарма вучыліся ў школе... Сёе-тое памятаем...

Край балотнага, перарэзанага меліярацыйнымі канавамі добрых венічкаў для лазні, масіву, які падступае да самых Міханавіч, што пад Мінскам. Зялёныя купіны, пакрытыя дурніцамі, журавінамі, пах багуну, стромкія бярозы, з якіх можна б было нарэзаць добрых венічкаў для лазні, розналоссе птушак...

Так было тут яшчэ летась. А цяпер? Едкі дым сцелецца над балотам, ахутваючы не толькі Міханавічы, але і бліжэйшае наваколле (а ў адну з начэй, відаць, дацягнула і да Мінска. Ва ўсякім выпадку, многія на яго паўднёвай ускраіне адчулі трывожны пах лясного пажару). Па свежых, яшчэ не кранутых агнём купінах коціцца патрэсквае абманліва-бяскрыўднае, невялікае, і тым не менш бязлітаснае полымя. Курыць, выгарае аголены торф. Ляжаць бярозы, карані якіх раптам пазбавіліся ўнізе ўсялякай апоры. З пачарнелым, звінячым лісцем, і побач жа — з зусім зялёнымі кронамі. Цішыня. Толькі чуваць, як патрэсквае агонь... Густы, амаль па шчыкалатку, попел пад нагамі. І нахабна лезе ў вочы машкара, якая адна тут, на гэтым гарэлішчы, таўчэ свой мак. Дым — да самага гарызонта.

У дыме не толькі Міханавічы. Абкурвае (не прадыхнуць) з боку наблізкіх лесу і балота Рудзенск, даносіць пах гарэлага да Пухавіч...

Гарыць у розных кутках Беларусі. У Барысаўскім лясгасе згарэла 500 га, Бягомльскім — 151, Пальмінскім лясніцтве — 300, у Старобіне — 150, Оршы — 50, Браславе — 30, Расонскім лясгасе — 66 га... Толькі за адзін нядаўні святочны дзень згарэла больш, чым за ўвесь мінулы год. 4.000 лясных пажараў (толькі зафіксаваных) за сёлетні год, 3,5 тысячы га лесу на іх пякельным рахунку. І гэта яшчэ не ўсё. Не ўсе гектары падлічаны ў Міністэрстве лясной гаспадаркі, не ўваходзіць у гэты пералік тое, што гарыць у ваенных, у калгасах...

Нават не гарым, а палаем! Дарэчы, добра яшчэ, што Гомельская вобласць адносна спакойная, а то, відаць, наглыталіся б пад завязку і радыеактыўнага дыму...

— На жаль, так, гарым нежартоўна, — стомлена пагаджаецца галоўны «пажарнік» Мінлясгаса, намеснік начальніка ўпраўлення І. Мыслейка, для якога «калі свеціць сонца — гэта самы чорны дзень», які і пазнаёміў з вышэйпрыведзенымі лічбамі. Ён жа, а таксама начальнік упраўлення М. Кузьмянкоў, які падключыўся да размовы пазней, у прыватнасці, расказалі.

У асноўным гараць Мінская (а ў ёй Пухавічы і Барысаў) і Віцебская вобласці. Гараць пераважна балоты, пакрытыя лесам, што зусім не па навуцы, бо па пажарнай небяспецы яны адносяцца да апошняга класа. Іх вельмі цяжка тушыць, бо звычайную тэхніку нельга выкарыстаць. На днях у Барысаве згарэў трактар. Два разы капнуў — і засеў. І згарэў. Не хвалюйцеся, трактарыст жывы. Спецыяльнай жа тэхнікі практычна няма, адзінкі на Полацкай і Валожынскай лясных меліярацыйных станцыях, ды пакуль перагоніш іх да месца пажару — там ужо попел.

Увогуле, бюджэт фінансуе лясную гаспадарку, разам з адукацыяй і культурай, па астаткаваму прынцыпу. За два гады ніводнай пажарнай машыны не купілі — няма сродкаў. У руках багацце — лес? Усё гэта багацце адбірае той жа бюджэт, які сочыць за ўсімі фондамі пільным вокам. У нармальных краінах на ахову лясоў накіроўваюць 50 працэнтаў усіх сродкаў, якія выдзяляюцца на вядзенне лясной гаспадаркі, у нас — усяго некалькі працэнтаў. З чаго выдзяляць? Не трэба далёка хадзіць за прыкладамі, возьмем Прыбалтыку. Там тры рублі затрат ідзе на адзін гектар лесу, у нас— 60 капеек. Просім: дайце сродкі на ўтрыманне начальнікаў пажарна-хімічных станцый у лясгасах (іх у нас 86), дык дзе там!

Даскарачаліся. У міністэрстве цяпер 38 чалавек, прычым непасрэдна лесам займаюцца 7, астатнія — бухгалтэрыя, забеспячэнне, прамысловая перапрацоўка і г. д. У Літве ў апараце — 70 чалавек, а лясоў у 4 разы менш. Затое ў нас у Дзяржаўным камітэце па экалогіі —130. Чым дапамагаюць? Спраўна даведкі патрабуюць!

Лясная галіна — самая закінутая. Таму і гарыць. Гаспадароў у лесе — дзесяткі, ні ў адной дзяржаве няма іх столькі. Хто яшчэ «кіруе» лесам? 700 тысяч га —у калгасаў, 500 тысяч — у ваенных, прыдбалі па добраму кавалку Міністэрства народнай адукацыі, Акадэмія навук, Мінскі і Полацкі гарвыканкомы... І нават АПК «Заходні Буг».

І ў іх таксама гарыць. У Друцкім ваенным лясгасе палае каля 1.000 га, у Гродзенскай вобласці (таксама ў ваенных) —да 100 га. Пад Бабруйскам ледзь не паўтарылася сітуацыя 1984 года, калі менавіта з-за лясного пажару «рванула». Праўда, зусім без гэтага не абышлося: выбухнулі старыя, з вайны, разагрэтыя снарады ў Ляхавіцкім раёне.

Невядома, як цяпер, але да гэтага ніколі не было чутно, каб, скажам, калгасы ці ваенныя паведамілі, што ў іх нешта згарэла. Усе «паралельныя» гаспадары заклапочаны адным — толькі і ведаюць, што займаюцца лясным бізнесам. У калгасах пытанні лясной гаспадаркі вядуць прарабы-будаўнікі. Сякуць! Год рыхтавалі праект пастановы аб перадачы лясоў у адны рукі — крыж на ёй паставілі. У асноўным тыя, хто валодае лесам.

Чаму гараць лясы і балоты? Засуха? Самаўзгаранні?

Усё зло — ад чалавека, ад яго экалагічнай неадукаванасці, дзікунства, раўнадушша. Самаўзгаранні торфу магчымыя толькі ў тым выпадку, калі ён знаходзіцца ў караванах (г. зн. у буртах), іншы раз можа спрацаваць у якасці лупы кавалак шкла, але такое здараецца надзвычай рэдка. Нягледзячы на пякельнае сонца і выключную сушу ў лясах і на балотах, лясныя пажары — гэта не стыхійнае бедства. Дастаткова кінуцца запалкі. Пры гэтым неверагодна: гараць балоты! Слава савецкім меліяратарам, нястомным пераўтваральнікам прыроды.

І самае сумнае, самае балючае: амаль нікога гэтыя пажары не хвалююць. Нават тады, калі агонь падступае да самага чалавечага жылля. Ніхто не кінецца, пачуўшы крык «Пажар!», за вароты свайго двара. Усе сталі абсалютна ні ад кога і ні ад чога не залежнымі. Нават ад свайго сумлення. «А-т, гарыць? Ну і няхай». Дзе «зялёныя патрулі»? У Рубе, знакамітай Рубе, якую разам з былым дырэктарам тамашняга «Даламіту» яшчэ не надта даўно так узмоцнена рэкламавала рэспубліканская прэса, калі туды прыехаў генеральны дырэктар Віцебскага лесагаспадарчага аб'яднання з просьбай дапамагчы (гарыць амаль побач з пасёлкам), без усялякай дыпламатыі проста паслалі падалей. Маўляў, не наша справа, на гэта ёсць ляснічы.

Ці выпадкова гарым? Ці не з-за таго ў першую чаргу, што мы самі выгаралі, счарсцвелі знутры?..

Па магчымасці я перадаў усё, што выказалі І. Мыслейка і В. Кузьмянкоў, для якіх, на вялікі жаль, чорныя дні прыцягваюцца, бо дажджоў па-ранейшаму няма. А спадзявацца

(Заканчэнне на 3-й стар.).

ДРУГІ — НЕ ДРУГАРАДНЫ...

Сёння стартуе другі нацыянальны чэмпіянат Рэспублікі Беларусь па футболу.

Першы блін (чытайце: чэмпіянат) аказаўся камяком... Сёння гэта — бясспрэчна. Праведзены ў адзін круг на працягу ўсяго некалькіх месяцаў, ён, па-першае, так і не дазволіў выявіць сапраўдныя суадносіны сіл, а, па-другое, не дасягнуў сваёй асноўнай мэты — удзелу прадстаўнікоў нашай суверэннай рэспублікі ў розыгрышы еўрапейскіх кубкавых турніраў. Па прамой віне кіраўніцтва Федэрацыі футбола Беларусі, якая яўна «праспала» і не змагла дабіцца ўключэння нашых прадстаўнікоў у барацьбу за Кубкі чэмпіёнаў, уладальнікаў кубкаў і УЕФА, самі спартсмены і шматтысячная армія аматараў футбола аказаліся, гаворачы спартыўнай тэрміналогіяй, у становішчы па-за гульнёй. І хоць сёння прэзідэнт федэрацыі Яўген Шунтаў імкнецца ўсяляк апраўдвацца (маўляў, мы рабілі па рэгламенту, так, як таго патрабуе еўрапейскі футбольны кодэкс і г. д., і да т. п.), выглядае гэта і наіўна, і зусім непатрэбным...

Такім чынам, другі нацыянальны чэмпіянат на старце. Ад першага ён адрозніваецца як складам удзельнікаў, так і рэгламентам. Да 16 удзельнікаў, што выступалі ў першай лізе раней, дабавіўся семнаццаты. Ім стаў... дубль мінскага «Дынама». Выйграўшы турнір у другой лізе, маладыя дынамаўцы, з аднаго боку, нібыта і заканамерна трапілі ў кагорту мацнейшых... Але давайце паразважаем над маральным бокам пытання. Так, у «Дынама» і раней, не кажучы пра цяперашні час, рэгулярна збіралі лепшых ігракоў не толькі з усёй рэспублікі, а нават і з-за межаў яе. Яны — мацней тых жа «абутнікоў» з Ліды ці «будаўнікоў» са Старых Дарог, ды і ўмовы для далейшага росту ў іх — непараўнальныя з іншымі... Але ці трэба было, па-першае, ужо сёлета займацца «зборам» лепшых сіл, а, па-другое, рабіць, так бы мовіць, ход канём: тэрмінова у пажарным парадку аддзяляць дублёраў ад асноўнага саставу «Дынама», «пераапранаць» каманду пад назву «Беларусь» (назву, дарэчы, не самую ўдалую — хіба можна, скажам, уявіць сабе футбольны калектыў з назвай «Францыя», «Данія ці Аргенціна»? — але гэта тэма для спецыяльнай размовы) і, такім чынам, праўдамі і няпраўдамі дабівацца ўяўнай самастойнасці?!

Не, штосьці не тое робіцца ў беларускім футболе ўжо на першай стадыі яго самастойнасці...

Рэгламент жа чэмпіяната наогул для рэспублікі нязвычны. Не падумаўшы ні пра аматараў, ні пра стан базы большасці каманд, арганізатары яго (тая ж Федэрацыя футбола) вырашылі хоць тут «вызначыцца»: спаборніцтвы пройдуць па сістэме, прынятай у большасці краін Еўропы, гэта значыць па прынцыпу «восень-вясна». Першы круг чэмпіяната каманды правядуць сёлета, другі — ранняй вясной наступнага, 1993 года. Уяўляем, як будуць выглядаць футбольныя палі тых жа Старых Дарог і Рэчыцы, Салігорска і Жодзіна, ды і на «Дынама» ў сталіцы асенняй халадэчай балельшчык штурмаваць касы наўрад ці паімкнецца...

І, тым не менш, у аматараў спорту, не кажучы пра саміх футбалістаў, — свайго роду свята. Маленькае, але ж свята. Другі нацыянальны чэмпіянат Беларусі прымае старт!

Анатоль ФЁДАРАЎ.

З КЛОПАТАМ ПРА ВЕТЭРАНАЎ

Прынята распараджэнне якое скіравана на ажыццяўленне пастановы Вярхоўнага Савета ад 17 красавіка 1992 года «Аб увядзенні ў дзеянне Закона Рэспублікі Беларусь «Аб ветэранах». У ім вызначаны міністэрствы, ведамствы, арганізацыі, адказныя за выкананне асобных пунктаў закона, дадзены канкрэтныя даручэнні. У прыватнасці, Міжжылкамгасу, Мінсувязі, Мінфіну, Мінзабесу, канцэрну «Белпалівагаз», аблвыканкомам і Мінскаму гарвыканкому прадпісана да 1 лістапада г. г. вызначыць прадастаўленне ветэранам ільгот па аплаце жылой плошчы, камунальных паслуг, паліва і за карыстанне тэлефонам. Міністэрству аховы здароўя за гэты ж тэрмін — вызначыць парадак забеспячэння ветэранаў, якія дасягнулі 70-гадовага ўзросту, па рэцэптах урачоў лекамі і медыкаментознымі сродкамі з 50-працэнтнай скідкай ад іх кошту. Мінтрансу, Міжжылкамгасу, Мінзабесу і Мінфіну па ўзгодненню з аблвыканкомамі і Мінскім гарвыканкомам таксама да 1 лістапада г.г. даручана вызначыцца з прадастаўленнем ветэранам права на бясплатны праезд усімі відамі гарадскога пасажырскага транспарту, а таксама транспарту агульнага карыстання ў сельскай мясцовасці ў межах адміністрацыйнага раёна па месцы жыхарства.

Служба інфармацыі Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Беларускае золата. Кландайк не абяцаюць, але...

НЕВЕРАГОДНА-АШАЛАМЛЯЛЬНАЕ ПАВЕДАМЛЕННЕ ПРАНЕСЛАСЯ ПА РЭСПУБЛІЦЫ: НЕДЗЕ ЗНОЙДЗЕНА ЗОЛАТА. АДНЫ УДАКЛАДНЯЛІ: ПАД ОРШАЙ. ІНШЫЯ АБВЯРГАЛІ, ПЯРЭЧЫЛІ: ДЫ НЯМА ТАМ НІЯКАГА ЗОЛАТА! ДЫК ШТО Ж НА САМАЙ СПРАВЕ!

З гэтым пытаннем і звярнуўся наш няштатны карэспандэнт да Фелікса Якаўлевіча БЕНСМАНА, кандыдата геолага-мінералагічных навук, намесніка дырэктара Беларускага дзяржаўнага навукова-даследчага геалагічнага прадпрыемства («Белгеа»).

І перш чым даць слова кампетэнтнаму субяседніку, некалькі пра тое, чаму выбар выпаў менавіта на Фелікса Якаўлевіча і прадпрыемства «Белгеа». Два гады назад, калі людзі пачалі называць многія рэчы сваімі імёнамі, група вучоных (а ўзначаліў яе доктар геолага-мінералагічных навук, член-карэспандэнт Міжнароднай інжынернай акадэміі Віталь Андрэевіч Маскві) толькі развёў рукамі: які непаваротлівы, гатовы толькі сябе пракарміць і абслужыць навуковы механізм у нас сфарміраваўся. А хіба ж навука— гэта не рызыка, не самаахвяраванне? Вось і вырашылі стварыць навуковую геалагічную структуру, альтэрнатыўную дзяржаўнай.

Лёгка сказаць — вырашылі. Тым больш, што тады, у 1990-м годзе нават малыя прадпрыемствы на Беларусі можна было па пальцах пералічыць. Таму і «стварыліся» як філіял Ленінградскага навукова-даследчага геалагічнага прадпрыемства. Кола задач вызначылі самае шырокае — гэта і геалогія, і гідрабіялогія, і экалогія. Расцэнкі ж за работу ўстанавілі на ўзроўні дзяржаўных.

— Што датычыцца золата, — расказвае Фелікс Якаўлевіч, — то пачалося ўсё яшчэ ў мінулым годзе. Мы займаліся бурштынам. Па вытворчых справах паехалі ва Ухту, дзе суспрэліся з заслужаным геолагам Расіі Аляксандрам Андрэевічам Котавым. Слова за слова, і раптам вядомы золаташукальнік гаворыць нам: «Хочаце, я ў вас золата знайду?..»

Спачатку мы асабліва і не дзівіліся. Пра існаванне золата на Беларусі навуковы свет ведае. Яшчэ гадоў дзесяць назад вытворчае аб'яднанне «Беларусьгеалогія» адкрыла залатыя жылы ў каменных пародах. Праўда, на глыбіні ў 200—300 метраў. Але ж здабываць золата з так званага фундамента—справа, што ні кажы, дарагая, можа нават таму золату па цане роўная.

Ды толькі Котаў ашарашыў іншым: не ведаеце, маўляў, зямелькі сваёй родный, геалагічнай яе гісторыі, а яшчэ дзяржаўную манаполію хочаце звергнуць. І літаральна аглушыў гэткай вось простай выкладкай: «Золата шукаюць у гарах, на іх схілах. А некалі ж — гадкоў гэтак мільярда паўтара назад — і на Беларусь усё зносілася з гор. Значыць, і золата... А яно, заўважым, хімічна не разлагаецца. Выходзіць, што недзе ляжыць. Схавалася вось толькі. Дык давайце шукаць...»

— І якімі былі першыя крокі?

— Самі разумееце, якія могуць быць крокі, калі грошай няма. «Белгеа» сваіх мільёнаў па банкаўскіх засеках яшчэ не назбірала. Таму і пайшлі з працягнутай рукой ва ўрадавыя калідоры. А там аднаго котаўскага запэўнівання, што, маўляў, няма раёнаў, дзе няма золата, для дзяржаўных мужоў мала. І ўсё ж нам паверылі. А заадно і пасмяяліся з таго, што Котаў паабяцаў першыя вынікі ў маі. Праўда, замест шасцісот тысяч рублёў, якія мы прасілі, далі толькі дзвесце пяцьдзесят... Запэўнілі: будзе станоўчы вынік — астатнюю суму дадзім.

Зіма, зразумела, не сезон. Таму асноўныя работы былі распачаты вясной. З Ухты геолагі-золаташукальнікі прыехалі з наборам свайго прамывачнага абсталявання. А з нашага беларускага боку да кіравання пошукамі падключыўся Юрый Аляксандравіч Дзеравянкін. Фактычна галоўны вучоны-«залатавік» па Беларусі. На сённяшні дзень праведзена рэкагнасцыроўка чацвёртай часткі рэспублікі. Золата (удакладнім: самароднае золата) знойдзена ў 90 з 104 адабраных проб. Пры гэтым у пяці з іх утрыманне каштоўнага металу перавышае мінімальна-прамысловыя нормы.

— Фелікс Якаўлевіч, і ўсё такі пра канкрэтныя адрасы радовішчаў...

— Не хацелася б называць гэтыя раёны. І не толькі ў мэтах захавання камерцыйнай тайны. Працаваць мы будзем на дзяржаву, у перспектыве на стварэнне залатога запасу Рэспублікі Беларусь... Справа вось яшчэ ў чым. Нават асабліва залатаносныя раёны каштоўныя не адным толькі золатам. Разам з каштоўным металам у прамысловых колькасцях у пясках знойдзены цырконій, тытан, што дазваляе лічыць такія залежы комплекснымі. А адпаведна і распрацоўка радовішчаў павінна весціся комплексна.

— Гаворка пра тое, што ў пошуку золата паралельна зроблена яшчэ некалькі адкрыццяў?

— Так. І варта дадаць — адкрыццяў, якія маюць вялікае эканамічнае значэнне для Беларусі. З цырконію, напрыклад, атрымліваецца выдатная сыравіна для вытворчасці керамікі і эмалі. А японцы выкарыстоўваюць цырконій нават у вытворчасці рухавікоў. Упершыню ў гэткай вялікай колькасці знойдзены касітэрыт (а гэта не што іншае, як сыравіна для волава). Знойдзены і руціл (тытан-ніябіевая сыравіна), ільменіт (аснова для вытворчасці фарбаў). У комплексе з золатам ёсць і магнетыт, які з'яўляецца гатовым жалезам. Словам, каштоўнасць праведзенай работы ва ўсіх гэтых адкрыццях.

— Фелікс Якаўлевіч, каб першыя крокі не набылі чарапашую хаду, патрэбны грошы. Ці адчувае «Белгеа» падтрымку дзяржавы?

— У канцы красавіка Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь прыняў рашэнне аб выдзяленні нам у гэтым годзе для правядзення рэкагнасцыроўкі і першачарговых пошукавых работ трох мільёнаў рублёў. Праўда, гэтых грошай вельмі і вельмі мала, бо толькі абсталяванне, якое, дарэчы, на Беларусі не робяць, каштуе 1,5—2 мільёны рублёў. Абяцаюць яшчэ дадаткова тры мільёны. Грошы, вядома, немалыя. Але і адшукаць золата, знайсці яго сляды няпроста. Тым больш, што працуе «Белгеа» з гарантыямі. Кландайк мы не абяцаем, але што быць Беларусі з залатым запасам — упэўнены. А гэта ж не проста метал сам па сабе... Золата ў дзяржаўных банках — гэта і пэўныя гарантыі вырашэння валютнай праблемы, магчымасць атрымання доўгатэрміновых крэдытаў.

Тое, што ў пошукі і здабычу золата выгадна ўкладваць грошы, сведчыць сусветны вопыт. Вось прыклады. У ЗША за перыяд з 1961 па 1983 гады на пошукі і разведку залатарудных радовішчаў было патрачана 8,5 мільярда долараў, а ў Канадзе — 6,5 мільярда. За гэты час у ЗША адкрыта 40 радовішчаў з запасамі 1.446 тон золата, а ў Канадзе — 20 з запасамі 870 тон. Сабекошт аднаго грама золата ў ЗША склаў 1 долар, а ў Канадзе 1,29 долара. І ўсё гэта пры сучасным сусветным кошце 12—16 долараў за адзін грам золата. Прыбытак відавочны. Але каб яго атрымаць, трэба і ўкласці... І калі гаварыць пра рублёвае вымярэнне ўкладанняў, то гэта, вядома, вельмі і вельмі вялікія сумы.

Гутарыў Алесь КАРЛЮКЕВІЧ.

Будзьце здаровыя!

АПТЭКА СУМЕСНАГА ПРАДПРЫЕМСТВА «БЕЛФАРМ», ХОЦЬ І НАЗЫВАЕЦЦА ВАЛЮТНАЙ, АДНОЛЬКАВА ВЕТЛІВА АБСЛУЖЫЦЬ ПАКУПНІКОЎ З ЛЮБЫМІ ГРАШАМІ. УСЕ ТАВАРЫ, ВЫСТАЎЛЕНЫЯ НА ПРОДАЖ У ВАЛЮЦЕ, МОЖНА НАБЫЦЬ І ЗА РУБЛІ. ЗРАЗУМЕЛА ПА КАМЕРЦЫЙНЫМ КУРСЕ.

За час паўсюднага дэфіцыту мы ўжо прызвычаіліся купляць абы-што абы ў каго, ставіць эксперыменты на ўласным здароўі. А вось фірма «Белфарм», створаная Міністэрствам аховы здароўя Беларусі і міжнароднай фірмай «Інтэрнэшнл Трэйд Маркетынг», надзейнасць сваіх лякарстваў гарантуе, як кажуць, на ўсе сто. Асартымент тавараў аптэкі, размешчанай па вуліцы Я. Коласа, а таксама аптэчных кіёскаў гасцініцы «Планета» і салонаў прыгажосці «Мара» і «Александрына» складаюць лекавыя прэпараты, зацверджаныя Міністэрствам аховы здароўя. І хоць фірма прапануе пакупнікам даволі вялікі выбар разнастайных сродкаў ад усялякіх хвароб, у хуткім часе мяркуецца ўзбагаціць аптэчны фонд яшчэ некалькімі дзесяткамі назваў. Справа ў тым, што інфармацыі аб замежных вынаходствах у фармакалогіі айчынным медыкам пакуль што вельмі не хапае, і стварэнне камп'ютэрнай базы даных па новых айчынных і імпартных лекавых прэпаратах уваходзіць у бліжэйшыя планы СП. Але і без такой базы аптэчныя ўстановы «Белфарма» выконваюць практычна любое жаданне кліентаў. Калі, напрыклад, патрэбных вам лякарстваў не акажацца ў продажы, дастаткова запоўніць спецыяльны бланк, і праз нейкі час атрымаеце свой заказ ледзь ці не з завода — яшчэ «цёпленькім». Падобна на казку? Ніякіх дзівосаў — толькі плаціце. Таму і разлічвае прадпрыемства ў першую чаргу менавіта на багатых як на асноўную кліентуру, — яны ж таксама, здараецца, плачуць ад розных хвароб.

— Наша медыцына павінна быць дзяржаўнай і прыватнай, — упэўнены намеснік генеральнага дырэктара па навуцы СП «Белфарм» кандыдат медыцынскіх навук А. Стома. — Дзяржаўная медыцына будзе абслугоўваць людзей сярэдняга дастатку, а прыватная — больш заможных. Ва ўсім свеце медыцына — рэч вельмі дарагая. У нас жа яна не каштуе амаль нічога — таму і якасць «на ўзроўні». У многіх нават своеасаблівая псіхалогія выпрацавалася: шкадуючы грошай на здароўе, усё жыццё будуць збіраць на машыну або на тэлевізійную скрыню. Таму і мяркую: варта перавесці ахову здароўя на нейкія іншыя формы. Напрыклад, страхавую. Такая практыка зараз шырока распаўсюджана на Захадзе. Фірмы самі сочаць за здароўем сваіх работнікаў, аплачваюць частку выдаткаў на лячэнне за кошт фірмы. У нас таксама ўжо ёсць некаторыя прадпрыемствы, якія пачынаюць практыкаваць падобную форму медыцынскага абслугоўвання. Наладжваюць супрацоўніцтва і з намі, купляюць у «Белфарма» лякарствы і распаўсюджваюць іх у сваіх паліклініках або аптэчных кіёсках... Зразумела, танным наш тавар не назавеш.

Ірына ЗАВАДСКАЯ.

РАДЗІМА НАША — БЕЛАРУСЬ

Аляксандр МАЙСНЕР:

«У Германіі мне не хапала б нашага бязладдзя...»

Маркуючы па звестках апошняга перапісу насельніцтва, на Беларусі жыве зараз тры з паловай тысячы немцаў. «Іншыя нацыянальнасці»— так сціпла і безыменна пазначаны яны ў выніковай табліцы.

Вялікі народ, вялікая культура, багацейшая гісторыя. Цяжка знайсці яшчэ еўрапейскі народ, з якім бы так своеасабліва, складана пераплаліся лёсы гэтага і нашых славянскіх народаў. Крывавыя войны — ад крыжацкіх нашэсцяў да паходу «трэцяга рэйха»— гэта адзін бок. І — амаль капіраванне асноў дзяржаўнага ўладкавання, ваеннага будаўніцтва, зямельных рэформ — другі. Як бы там ні было, а ніводнай старонкі з гісторыі вырваць ужо нельга...

Сённяшні госць «Звязды»— старшыня таварыства немцаў Беларусі «Відэргэбурт»— «Адраджэнне», дырэктар Цэнтра нямецкай культуры Аляксандр МАЙСНЕР.

— Масавае пранікненне немцаў на славянскія землі пачалося ў XVIII стагоддзі, а калі быць дакладным —у 1764 годзе. Імператрыца Кацярына II запрасіла нямецкіх рамеснікаў, майстроў, сялян прыехаць у гэтую краіну, заспаваць калоніі, каб разам узняць яе. Размах для дзейнасці быў шырокі. Вядома ж, немцы жылі тут і раней, яшчэ ў дапятроўскія часы, але не так масава. Думаю, няма патрэбы казацца далёка ў гісторыі. Пяройдзем да больш блізкага часу, калі нямецкія каланісты сталі засяляць і заходнія губерні Расіі.

Спачатку яны з'явіліся на Украіне — у ваколіцах Валыні, а ўжо адтуль частка немцаў перабралася і ў Беларусь, на Гомельшчыну — у Нароўлю, Ельск, Лельчыцы. Вось тут і жылі масава мае землякі доўгі час. Жылі яны ізаляванa, стараліся не змешвацца з мясцовым насельніцтвам, захоўваючы свой этнас, культуру, традыцыі. Не ўсё было лёгка і проста ў іх. Не даводзіцца гаварыць аб прыязных адносінах улад ды і простага люду.

Асабліва абвастрылася сітуацыя напярэдадні першай сусветнай вайны і ў час рэвалюцыі — калі адбываўся гвалтоўны захоп зямель, а таму немцы вымушаны былі кідаць наседжаныя месцы і шукаць лепшай долі на гістарычнай радзіме. У 1918 годзе з 50 тысяч маіх суайчыннікаў, якія насялялі беларускія землі, засталіся ўсяго 3 тысячы. Вось гэтая лічба захавалася практычна да сённяшняга часу, хоць на самай справе немцаў тут, вядома, больш. Проста ў гады сталінскіх рэпрэсій многія вымушаны былі змяніць сваю нацыянальнасць, прозвішча. У некаторых выпадках гэта адбывалася і натуральным шляхам — змешаныя шлюбы, напрыклад. Быць не немцам было больш бяспечна. Але сёння я ганаруся тымі сваімі землякамі, якія захавалі, нягледзячы ні на што, сваю нацыянальную прыналежнасць.

— Але давайце пагаворым аб самім таварыстве «Адраджэнне»...

— Яно ўзнікла ў канцы 1989 года, неўзабаве пасля таго, як у Маскве адбыўся ўстаноўчы сход немцаў СССР. Я даведаўся аб ім з маленькай заметкі ў «Правде». Тады я і стаў шукаць сваіх землякоў, хоць да таго часу на поўным сур'ёзе думаў, што на Беларусі я адзіны немец. Удалося надрукаваць некалькі матэрыялаў у газетах, пайшлі водгукі, затым некалькі чалавек сабралася, утварылі аргкамітэт — вось так і ўзнікла «Адраджэнне». Зараз наша таварыства налічвае больш за 100 чалавек.

Нашы задачы з доляй гумару мы падзяляем на «знешнепалітычныя» і чыста «ўнутраныя». Таварыства стваралася з мэтай дабіцца ўзнаўлення рэспублікі немцаў у Паволжы, каб усе жадаючыя змаглі вярнуцца на тыя землі, з якіх іх продкі былі выселены гвалтоўна, адкрыць там свае школы, газеты — жыць нармальным, паўнацэнным жыццём. Але зараз гэтае пытанне зайшло ў тупік і сур'ёзна гаварыць аб Паволжскай рэспубліцы не прыходзіцца, ды і жадаючых паехаць туды многа не знойдзецца: сацыяльная неўладкаванасць не вабіць нікога. Ну а паколькі цяга людзей да адраджэння сваёй мовы, да таго, каб можна было свабодна карыстацца здабыткамі айчыннай літаратуры, музыкі, стварыць уласны тэатр, захавалася, то нічога не застаецца, як рабіць гэта на месцы.

Калі браць пад увагу беларускую асаблівасць, то тут мы якраз і маем выключна культуралагічныя мэты. Мы хочам адкрыць школы — пакуль што нядзельныя ці вячэрнія, вывучаць гісторыю Германіі, немцаў у Расійскай імперыі і СССР. Для гэтага маем намер наладжваць сувязі непасрэдна з Германіяй, але не толькі культурныя, а і дзелавыя. Каб рухаць культуралагічную праграму, трэба мець грошы. Не хочацца ісці з працягнутай рукой — мы будзем іх зарабляць, ствараючы сумесныя прадпрыемствы, выконваючы ролю пасрэднікаў паміж беларускімі прадпрымальнікамі і германскімі. Зараз якраз такія кантакты наладжваюцца.

— Якія ў вас сувязі непасрэдна з Германіяй?

— Ёсць ужо канкрэтныя прапановы і ў плане эканамічнага супрацоўніцтва, і развіцця культурных адносін. У прыватнасці, Міжнародным саюзам немцаў будзе аказана дапамога ў стварэнні ў Мінску інстытута Гётэ, які з'явіцца асяродкам нямецкай культуры ў Беларусі. Я ведаю, што размовы аб гэтым ужо вядуцца на міжурадавым узроўні. Гэта будзе спрыяць узаемаўзбагачэнню нашых культур. Той жа Міжнародны саюз, які працуе ў многіх краінах, дзе кампактна пражываюць немцы, прышле вучэбныя праграмы для нашых школ, падручнікі, кансультантаў.

— А адносіны з беларускімі ўладамі?

— На ўзроўні Вярхоўнага Савета зараз вырашаецца пытанне аб статусе нацыянальных меншасцей, у тым ліку, вядома, і нямецкай. Мы спадзяёмся, што нашы праблемы будуць пачуты і не пакінуты без увагі. А турбот усялякіх хапае — нам патрэбна памяшканне, дзе можна было б сабрацца, размясціць факс і ўсе неабходныя службы. Як жа працаваць сур'ёзна без гэтага, выходзіць за мяжу? На жаль, усе пытанні вырашаюцца марудна.

Свае школы мы маглі б адкрыць хоць сёння, але вырашылі пачакаць да восені. Дапамогу тут аказваюць розныя беларускія культурныя цэнтры і нават прамысловыя прадпрыемствы. Абяцаюць на льготных умовах прадаставіць аўдыторыі, забяспечыць настаўніцкімі кадрамі. Такое супрацоўніцтва можа быць узаемавыгадным: у Германіі пражывае даволі вялікая па колькасці беларуская дыяспара — ёй жа таксама патрэбна дапамога, каб беларуская культура змагла развівацца далёка ад сваёй радзімы.

— А можа, усім нацыянальным меншасцям трэба было б аб'яднацца ў нейкі саюз, каб разам вырашаць такія пытанні?

— У нас ужо ёсць Каардынацыйная рада, куды ўваходзяць прадстаўнікі ўкраінскага таварыства, яўрэйскага, азербайджанскага... Мы часта сустракаемся, распрацоўваем планы дзеянняў. Вядома, так лягчэй многага дабіцца.

— Жаданне немцаў выехаць у Германію — што гэта: покліч крыві ці натуральнае чалавечае імкненне жыць у матэрыяльна забяспечаным свеце, створаным хай сабе і чужымі рукамі?

— Я думаю, тут ёсць і тое, і другое. Хоць асноўнае ў гэтым імкненні — застацца немцамі. Аб жыццёвых праблемах я ўжо казаў: неўладкаванасць, адсутнасць дапамогі... Прапаноўваюць нам зараз нейкі раён на тэрыторыі Украіны. Але ж дзе гарантыі, што праз некаторы час не ўзнімецца там хваля і не прыйдзецца тады зноў зрывацца з месца. Нас гэта стаміла, мы аседлы народ, да вандровак не прывыклі. Выехаць адсюль для многіх — таксама не простая справа, карані ўсё ж сядзяць глыбока і ў гэтай зямлі. Ведаеце, я ўпэўнены: у Германіі вельмі хутка засумаваў бы, мне не хапала б нашага беспарадку, бязладдзя, да якога мы ўжо так прывыклі. Настальгія ёсць ва ўсіх. Але даводзіцца выбіраць.

Некаторыя людзі, разважаючы аб міжнацыянальных праблемах на абшарах былога Савецкага Саюза, сцвярджаюць, што чым больш розных народаў жыве кампактна на адной тэрыторыі, тым больш узнікае ў іх розных праблем, якія падчас заканчваюцца кровапраліцем. Я ж звычайна кажу: шматнацыянальнасць — гэта не бяда, а багацце наша, якое толькі ў нейкі перыяд гісторыі трапіла ў нас у благія рукі. На шчасце, гэтую памылку можна выправіць.

Анатоль СЛАНЕЎСКІ.

Надоўга запомніцца гэта лета беларускім дзецям, якія тры дні правялі ў нямецкім горадзе Гютэрсла. Арганізавалі гэту акцыю ашчаднаса горада і распарадчык Фонду дапамогі дзецям Чарнобыля, дырэктар фірмы «Шпаркасе» пан Вінклер.

Для гасцей была распрацавана цікавая праграма. Шмат радасці даставіла ім наведванне заапарку, лепшага ў горадзе басейна. Багатыя людзі Гютэрсла пакаталі беларускіх дзяцей на ўласных самалётах. У сем'ях для іх наладжвалі дамашнія святы з рознымі гульнямі і забавамі.

Было таксама арганізавана наведванне паліцэйскай школы ў Штуткенброку, завода па вытворчасці пральных машын «Веле».

— Наша задача — паказаць не толькі «шакаладную» Германію, — гаворыць пан Вінклер.— Мы хочам, каб дзеці ўбачылі, якой працай здабываецца гэты дабрабыт. І ўлічылі гэта ў сваім будучым жыцці.

НА ЗДЫМКУ: шведскі стол у паліцэйскай школе.

Фота Аляксандра ТАЛОЧКІ.

(БЕЛІНФАРМ).

РОЗДУМ ПАСЛЯ СУДА

Пагуляла дубінка па спінцы,

АБО ЦІ ЗАЎСЁДЫ СУПРАЦОЎНІКІ МІЛІЦЫІ Ў ЭКСТРЭМАЛЬНЫХ УМОВАХ ДЗЕЙНІЧАЮЦЬ ЗГОДНА З ЗАКОНАМ

Не кожны тыдзень і нават месяц бывае, каб на лаве падсудных сядзелі ахоўнікі закона і правапарадку — работнікі міліцыі. І такая ж рэдкая з'ява, каб прыгаворам народнага суда быў незадаволены не толькі два бакі — вінаватыя і пацярпеўшыя, але і асобныя сведкі, адносна якіх суд хадайнічае перад пракуратурай аб узбуджэнні крымінальнай справы. І тое, і другое здарылася ў Гомелі на адным судовым працэсе. Як і чаму — наш расказ ніжэй.

СЛЕДЧАМУ ПРАКУРАТУРЫ Савецкага раёна М. Ядчанку, калі ён пісаў абвінавачвае заключэнне, усё было зразумела. Апытаны сведкі, выслуханы тыя, хто абвінавачваецца ў цяжкім злачынстве, зроблены вочныя стаўкі, ёсць заключэнне судова-медыцынскай экспертызы і да т. п. Праўда, давялося патраціць шмат часу на розныя ўдакладненні і праверку дадатковых фактаў і заяў, якія былі вельмі важнымі. І вось канчатковая думка следчага — смерць аўтаматчыка вытворчавучэбнага прадпрыемства глухіх Леаніда Леўчанкі ў дзень яго трыццацігоддзя наступіла ад шматлікіх пабояў, якія нанеслі яму міліцыянеры Сяргей Пархоменка, Юрый Пількевіч і рабочы малога прадпрыемства «Усход», былы супрацоўнік рабочага атрада садзейнічання міліцыі Аляксандр Белін.

У гэтым ён пераканаўся пасля таго, як у другі раз выклікаў апошняга сведку — плавільшчыка вагонарамонтнага завода Сяргея Скачкова і сказаў:

— Хоць раней вы сцвярджалі, што гаворыце праўду, мы ўсё ж вырашылі праверыць вашы паказанні. Для гэтага па нашай просьбе ў Гомель прыязджалі галоўны судмедэксперт Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь Максімаў, які мае трыццацігадовы стаж работы, загадчык аддзела складаных экспертыз гэтага ж міністэрства Кузьмічоў, судмедэксперт кандыдат навук Гусакоў і загадчык кафедры Мінскага медінстытута прафесар Пучкоў. Іх заключэнне такое. Смерць Леўчанкі наступіла ад траўматычнага шоку, які развіўся ў выніку пашкоджанняў галавы, шыі, тулава і ўнутраных органаў. А вось ранейшае заключэнне гомельскага судмедэксперта Куркаева. На целе загінуўшага кровападцёкі ў мяккіх тканках патылічнай і лобнай частак галавы, ніжняй губы, шыі, спіны, калена, сінякі на твары і падбародку, у тканцы сонечнага спляцення. Прычына смерці — спыненне работы сэрца з-за кровазліцця пад яго абалонку ў галаўны мозг.

Сведка ўважліва слухаў следчага і, здавалася, неяк насцярожана чакаў пытання. Яно не прымусіла сябе доўга чакаць:

— Раней вы насупернак усім астатнім сведкам заявілі, што бачылі, як Леўчанка быццам бы ўцякаў ад міліцыянераў і, спатыкнуўшыся, упаў грудзьмі на лаўку. Так гэта было ці не? Сур'ёзна папярэджваю вас аб крымінальнай адказнасці за хлуснюю!

Плавільшчык тут жа панік і ціха прамовіў:

— Ад першых паказанняў я адмаўляюся. Тады сказаў няпраўду. У міліцыі мяне папрасілі. Не змог адмовіць.

Такім чынам, перад следчым паўстаў малюнак таго злашчаснага вечара 26 мая мінулага года. Леанід Леўчанка прыйшоў у кафэ «Адпачынак» пасля дваццаці дзвюх гадзін. Толькі што ён з жонкай і трыма гасцямі адзначыў свой дзень нараджэння. Як засведчыла судмедэкспертыза, быў ён у сярэдняй ступені ап'янення. З куфлем піва колькі часу сядзеў за столікам і чакаў сваю сваячку Вольгу Дзегцярову, якая працавала тут афіцыянткай, каб пасля здачы ёю выручкі ў буфет разам ісці дадому. І тут перад самым закрыццём кафэ пачуўся звон разбітага шкла. Нехта пазваніў у міліцыю. Хутка прымчала машына патрульна-паставой службы, у якой знаходзіліся старшы наряда Аляксандр Дзятлаў, Сяргей Пархоменка, Юрый Пількевіч, да якіх у кафэ далучыўся і памянёны вышэй Аляксандр Белін. Яны пачалі высвятляць, хто з'яўляецца зачыншчыкам пагрому, і не змаглі гэтага зрабіць, бо, па-першае, ніхто не хацеў браць віну на сябе, а, па-другое, адміністратар кафэ Ганна Аніскова сказала, што гэта нібыта зрабіў нехта адтуль, з вуліцы. Двое міліцыянераў аб'ехалі яе завулкі і нічога падазронага там не знайшлі.

Тады позірк іх спыніўся на Леаніда, па абліччу якога было відаць, што ён выпіў, і нехта з іх спытаў, ці не яго рук гэта справа? Ці яны груба абышліся з імі, ці ён з імі (павінен устанавіць суд), але толькі, як кажуць сведкі, па спіне і галаве Леўчанкі пачалі хадзіць дубінкі. Ён апынуўся на падлозе, дзе яго білі нагамі, а потым пацягнулі ў машыну. Вольга Дзегцярова кінулася туды, прасіла адпусціць яго. Там яна ўбачыла жудасны малюнак. Адзін трымаў Леаніда за шыю, другі лупцаваў гумавай палкай па спіне і галаве. Вольга схапіла другую дубінку і ў бяссільнай злосці ляснула па капоту машыны. Яе схапілі за валасы і павалілі. Яна атрымала лёгкія цялесныя пашкоджанні. Даталося і арганізатару культурна-забаўляльнай праграмы кафэ Сцяпану Турбалу, які даказваў, што Леўчанка не біў шкла. Супраць яго быў прыменены прыём, і ён таксама апынуўся ў машыне, на якой яго і Леаніда завезлі ў аддзел міліцыі. Там праз некалькі хвілін Леўчанка і скаснаў. Такія вось паказанні сведкаў, якія былі дадзены ў некалькіх апытаннях у час папярэдняга следства і на вочных стаўках.

Міліцыянеры ж сцвярджалі іншае. Ніхто з іх гумавай палкай, маўляў, не біў Леаніда, хоць, калі яго адпусцілі з машыны па просьбе афіцыянткі, ён урэзаў па твары Юрыю Пількевічу і сарваў пагон. Таму давялося зноў усадзіць яго ў машыну. Пазней з'явілася версія: Леаніда, відавочна, адлупцаваў нехта яшчэ да прыезду міліцыі. А яшчэ праз некалькі месяцаў раптоўна «выплыла» фігура Сяргея Скачкова, які раней нідзе не ўпамінаўся.

І вось больш чым праз год расследаванняў, удакладненняў і скаргаў людзей на тое, што справа быццам бы заціраецца, судовы працэс пад старшынствам Віктара Цыганка. Не будзем даследаваць усе яго перыпетыі, аднак зазначым, што Сяргей Скачкоў зноў паўтарыў на ім свае першыя паказанні. Аб тым, што Леўчанка нібыта ўдарыўся аб лаўку, сказаў на судзе і камандзір узвода асобнага батальёна Уладзімір Грышчанка, які гэтую важную акалічнасць раптам успомніў менавіта на судзе, а раней пра яе — ні слова.

Суд палічыў іх паказанні лжывымі і вынес пастанову аб узбуджэнні супраць іх крымінальнай справы. Сяргей Пархоменка асуджаны на сем, Юрый Пількевіч і Аляксандр Белін — на шэсць з палавінай гадоў пазбаўлення волі ў калоніі ўзмоцненага рэжыму. Усе пералічаныя вышэй не згадзіліся з рашэннем суда: да іх, бачыце, паставіліся несправядліва. Але наконт рашэння суда абурылася і жонка Леўчанкі. Яна лічыць, што за смерць ні ў чым не вінаватага мужа злачынцы атрымалі вельмі малое пакаранне. Вядома, касацыйныя скаргі будуць разгледжаны калегіяй абласнога суда па крымінальных справах самым скрупулёзным чынам, і мы ўпэўнены, што вось гэта публікацыя ніколькі не паўплывае на яе рашэнне. бо не робяцца нейкія там вывады, а толькі канстатуюцца факты, выкладзеныя адным і другім бакамі. Аднак хацелася б паразважаць аб наступным.

У якасці пратэсту на рашэнне суда некалькі дзён не выходзілі на работу супрацоўнікі асобнага батальёна патрульна-паставой службы і следчага аддзела Савецкага РАУС. Каб з-за гэтага ў горадзе не ўзніклі беспарадкі, да патрулявання на вуліцах прыйшлося прыцягнуць армейцаў. Міліцыянеры, да таго ж заявілі, што пасля суда над іх таварышамі ўтаймоўваць п'янтосаў яны не будуць. Што тут скажаш?

Так, абсалютная большасць супрацоўнікаў органаў унутраных спраў рэспублікі заслугоўвае падзякі. Міліцыянеры сапраўды знаходзяцца на пярэднім краі барацьбы са злачынцамі, якіх апошнім часам значна пабольшала. Так, служба міліцыянераў напружаная, а нярэдка і небяспечная, таму ім даводзіцца дэманстраваць усё сваё прафесіянальнае ўменне, вялікую вытрымку і фізічную сілу. І ўсе мы ўдзячныя ім за іх работу, за тое, што, як сказаў паэт, мая міліцыя мяне беражэ. Закон аб міліцыі дае ёй шырокія правы ў навядзенні грамадскага парадку, але ў той жа час папярэджвае: змагацца са злачынствам незаконнымі метадамі — недапушчальна. Недапушчальна таксама, калі асобныя міліцыянеры перавышаюць свае паўнамоцтвы, прымяняюць насілле, што выклікае траўмы, а іншы раз і смерць, зневажаюць чалавечую годнасць.

Не хацелася б зноў звярнацца да таго трагічнага выпадку ў кафэ «Адпачынак», каб не наступныя факты.

Калегія абласнога суда толькі што разгледзела касацыйную скаргу аднаго падлетка, якога міліцыянер, стрэліўшы ў яго, зрабіў інвалідам другой групы. І што ж? Пакінула ў сіле прыгавор суда Навабеліцкага раёна — падлетак быў асуджаны, а міліцыянер апраўданы. Прычына? Хлопец, узбуроіўшыся ружжом, расстраляў вокны ў школе, пагражаў людзям, а калі на іх выклік з'явіўся міліцыянер, пацэліў і ў яго. Ды толькі ахоўнік правапарадку, які дзейнічаў у экстрэмальных умовах, аказаўся спрытнейшым.

Гэта толькі адзін прыклад таго, што прымяненне зброі міліцыяй пракуратура і суд прызнаюць правамернымі. А колькі іх яшчэ—не пералічыць.

— І вось на гэтым фоне,— расказвае пракурор вобласці Уладзімір Пятровіч Гаўрыльчык,— ганебным дысанансам выглядаюць учынкі асобных міліцыянераў.— Не буду каменціраваць дзеянні тых, хто па выкліку прыехаў тады ў кафэ «Адпачынак», аднак разумею Леўчанку, які абурыўся, што яго хочуць забраць у міліцыю. І ў той жа час не апраўдваю яго, калі ён лаяўся ці нават біўся. (Між іншым, аб нейкіх там драпінах ці іншых пабоях на тварах міліцыянераў у матэрыялах следства —ні слова — **У. П.**). А што гэта за «салідарнасць», калі міліцыянеры і следчыя, не згаджаючыся з рашэннем раённага суда, баставалі? Яны што — закона не ведаюць? Ведаюць, але не паважаюць. Бо пасля можна абскардзіць яго рашэнне яшчэ не ў адной інстанцыі. Такі метад — ні што іншае, як спроба націснуць на судовыя органы.

Уладзімір Пятровіч паведаміў таксама, што і ў Рэчыцы работнікі міліцыі на горкі яблык збілі чалавека, а калі адпаведныя органы прызналі іх дзеянні неправамернымі, спрабавалі баставаць. Перавысілі свае паўнамоцтвы таксама работнікі Буда-Кашалёўскага РАУС. Для высвятлення абставін адной пікантнай справы яны запрасілі старшыню гаспадаркі з'явіцца ў міліцыю. Той не прыехаў. У такім выпадку законам прадугледжаны адміністрацыйны штраф. Абысціся ім работнікі міліцыі не пажадалі і ў час узнікшага канфлікту паранілі жонку старшыні калгаса. Пры гэтым у газеце «На страже Октября», калі яшчэ ішло следства, хто-ніхто спрабаваў іх дзеянні апраўдаць.

А калі работнікі міліцыі не паважаюць закон, дык ці будуць яго паважаць іншыя? Галоснасць, станаўленне прававой дзяржавы, канцэпцыю судова-прававой рэформы некаторыя спрабуюць падагнаць пад свой аршын. Так, у Гомелі сабраліся маці дзетак, якія цёмнай ноччу бяруць людзей за горла, рабуюць, гвалтуюць, учыняюць іншыя злачынствы. Сабраліся для чаго? Каб ім дазволілі правесці на плошчы мітынг з патрабаваннем вызваліць іх дзяцей са следчага ізалятара. Хто-ніхто з высокіх інстанцый горада быў не супраць, але, пракансультаваўшыся з адпаведнымі органамі, своечасова адумаўся.

Усе мы павінны падпарадкоўвацца закону. У тым ліку і міліцыя. І калі не без прычыны па спіне вінаватага пагуляе дубінка яе супрацоўнікаў, калі яны супраць злачынцаў пусцяць у ход зброю — гэта павінна рабіцца на законнай падставе. Ігнараванне ж закона, самавольства нават і ахоўнікаў правапарадку непазбежна вядзе да лавы падсудных Іншай альтэрнатывы няма.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

РОЗГАЛАС

У РЭСПУБЛІЦЫ ПА НАШАЙ ВІНЕ ПАЛАЮЦЬ ЛЯСНЫЯ ПАЖАРЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

ім, як можна зрабіць вывад з іх жа слоў, амаль няма на каго. Толькі на Бога, на тое, што ён пашле нарэшце дождж.

Шмат горкіх слоў прагучала ў адносінах да многіх ведамстваў, да Саўміна, уся дапамога якога абмяжоўваецца словамі накшталт «узмацніць», да прэсы, якая «маўчыць». У многім справядлівыя словы, хоць, напэўна, нямала хібаў можна знайсці і ў самім «лясным» ведамстве. Але галоўную думку варта прыняць поўнасцю: прыйшла бяда — трэба змагацца з ёй усёй грамадой. Гэта ж не проста лясы і балоты гараць (дарэчы, балоты вызначаюцца самай багатай біясферай, якая гіне прама на вачах) —гарыць наша зямля. Нішчыцца родная прырода, страты ад чаго нельга вызначыць ніякай цаной. Дарэчы, наконт падлікаў страт. Вось парадокс неверагоднае чалавечае глупства: лічым, колькі згарэла ў лесе, на балоце палак. І ўсё!

Апошняе. Некаторыя аблвыканкомы, па рэкамендацыі Мінлясгаса, забаранілі наведванне лясоў і балот падчас гэтага крайне небяспечнага перыяду. Выключна ўсім. Заўзятаму аматару цяжка з гэтым пагадзіцца, ды і ці прысутнічае ў гэтай забароне нейкая прававая база, і, тым не менш, можа, пацерпім?

Інакш, відаць, проста нельга.

Іван БАРАНОЎСКІ.

● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ

«ГОЛАС АМЕРЫКІ»

Перадвыбарная кампанія дэмакрата Б. Клінтана набывае дзіўныя рысы. Створана спецыяльная жаночая каманда, мэта якой сачыць за тым, каб маладыя жанчыны лёгкіх паводзін не кампраметавалі дзеячаў дэмакратычнай партыі ЗША. Бо бліскучая кар'ера папулярнага сенатара Харта, які быў вылучаны кандыдатам у прэзідэнты на мінулых выбарах, сумна скончылася ў выніку яго сувязі з падобнай прыгажуняй.

Заканадаўцы-дэмакраты ў кангрэсе ЗША рэзка асудзілі адміністрацыю Буша за тое, што яна пагадзілася на выключэнне амерыканцаў з саставу камісіі ААН па праверцы ў Іраку міністэрства сельскай гаспадаркі.

Прэзідэнт Буш заклікаў прыхільнікаў Р. Перо даць яму яшчэ адзін шанц заваяваць іх давер пры галасаванні. Але, згодна з апытаннем, у Каліфорніі ўсё больш пачынаюць падтрымліваць дэмакратаў. 62 працэнты выказаліся ў падтрымку Клінтана, за Буша — 28 працэнтаў.

РАДЫЁ «СВАБОДА»

План па размяшчэнню ў Еўропе бежанцаў з Босніі і Герцагавіны будзе абмеркаваны на пасяджэнні ААН. Пад агнём у гэтых рэспубліках знаходзяцца ўкраінскія ваеннаслужачыя, якія ўваходзяць у састаў міратворчых сіл ААН.

Камандуючы Паўночна-Заходняй групай войск генерал-палкоўнік Маёраў сустрэўся ў Таліне са Старшынёй Вярхоўнага Савета Эстоніі Руйцалем. Апошні паўтарыў патрабаванне аб тэрміновым вывадзе войск з тэрыторыі рэспублікі.

ЗША і Ізраіль дамовіліся дапамагаць пяці былым савецкім сярэднеазіяцкім рэспублікам. Будзе сфарміравана група, якая канкрэтызуе гэту дапамогу з урадамі рэспублік.

Прэм'ер-міністр Польшчы Сухоцкая заявіла, што асноўнай эканамічнай праблемай з'яўляецца існаванне ў краіне побач са свабодным рынкам устарэлай цяжкай індустрыі. Як яна заявіла, пабудаваныя пры камуністычным рэжыме буйныя прадпрыемствы не адпавядаюць рыначным адносінам.

Ірак узмацніў атакі на поўначы краіны на курдаў і на поўдні — на мусульманшыітаў. Іх падвяргаюць бамбардзіроўкам і артабстрэлам. Гэтыя акцыі з'яўляюцца грубым парушэннем пастановы ААН.

Лівія звярнулася ў ААН з запытам аб накіраванні ў краіну інспектараў, каб тыя маглі пераканацца, што там не існуе баз па падрыхтоўцы тэрарыстаў. Лівія запэўнівае, што адмовілася ад падтрымкі міжнародных тэрарыстычных арганізацый.

● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ

Гарбузом і мармеладам... па радыенуклідах

Раскажыце, калі ласка, як можна выводзіць з арганізма радыёнукліды ў звычайных умовах. Чарнобыль дае знаць аб сабе кожны дзень, радыенукліды паступаюць у наш арганізм з ежай. Ваш адказ, спадзяюся, будзе карысны ўсім.

А. ВЯРЦЕЙКА.

Мінскі раён.

Спрыяюць вывядзенню з арганізма лішкаў вадкасці і разам з ёю шлакаў і радыенуклідаў мінеральныя солі. Пры вяласці кішэчніка, атаніі, хранічных запорах для нармалізацыі рэкамендуецца рэвень, які ўздзейнічае як лёгкае слабіцельнае.

Уласцівасць узбуджаць дзейнасць стрававальнай сістэмы мае агародны шпінат. Аблягчае застойванне ежы і кмен.

Плады, якія ўтрымліваюць значную колькасць пекцінавых рэчываў, здольныя паглынаць і выводзіць цяжкія металы, шлакі і радыенукліды — як тыя, што ўтвараюцца ў арганізме, так і тыя, што паступаюць у яго.

Па ўтрыманню пекціну адно з першых месц займае гарбуз. Яго мачагонныя ўласцівасці значна павышаюць эфектыўнасць вывядзення радыенуклідаў. Багаты набор вітамінаў (C, B_1, B_2, PP, E) надаюць гарбузу ўласцівасць радыёпратэктара, нейтралізацыі свабодных радыкалаў часцінак, якія з'яўляюцца ў клетцы з-за апраменьвання і разбураюць яе.

Багатыя пекцінам бульба, яблыкі, сельдэрэй, шыпшына, соя, буракі.

Трэба ўжываць у ежу больш ягад і фруктаў з высокім утрыманнем пекціну: суніц, абрыкосаў, алычы, вішні, кізілу, слівы, ажынаў. Добра захоўваюцца працёртыя з цукрам каліна, чорныя і чырвоныя парэчкі, маліна. З фруктаў і ягад можна прыгатаваць канфіцюр альбо мармелад, у якіх утрыманне пекціну нават узрастае.

ПЫТАЛЬНІК

ДАРАГОЕ ЗАДАВАЛЬНЕННЕ

Зусім выпадкова трапіў у выцвярэзнік Першамайскага раёна, аддаўшы за начлег даволі круглую суму — 250 рублёў. Шкада, а што зробіш! Скажыце, калі ласка, колькі выцвярэзнікаў у Мінску наогул і ці аднолькавая ўсюды аплата.

С. Ш.

Мы вам спачуваем, што вам так не пашанцавала. Але ж вы не першы і не апошні. У Мінску выцвярэзнікі ёсць у трох раёнах: Маскоўскім, Заводскім і Першамайскім. І ва ўсіх гэтых «установах» плата аднолькавая — 250 рублёў за ноч. Дарагое, трэба сказаць, задавальненне. Але жадаючых тут «адпачыць» хапае.

Напрыклад, у Першамайскім выцвярэзніку за першае паўгоддзе г. г. «начавала» 2.634 чалавекі.

Колькі трэба даць «на чай»?

— Калі прыходзіцца хадзіць у рэстаран або ездзіць у таксі, увесь час узнікае «няёмкасць» з так званымі «чаявымі». Кожны раз хвалююся, каб не даць іх менш ці больш, чым трэба. Ці ёсць тут якія-небудзь нормы ці абмежаванні?

М. ТРАХІМОВІЧ.

г. Мінск.

Пытанне чытача аказалася даволі незвычайным, але нам усё ж удалося знайсці на яго адказ. У Беларусі, як і ў іншых краінах СНД, пэўных традыцый давання «на чай» і адпаведна нейкіх норм не існуе. Затое ў дзяржавах Захаду ўжо усталяваліся пэўныя, скажам так, каэфіцыенты, па якіх прынята расплачвацца звыш належнага з таксістамі, афіцыянтамі і г. д.

Напрыклад, у лонданскім рэстаране сярэдняга класа трэба даваць «чаявыя» афіцыянту ў размеры 15 працэнтаў ад кошту заказу, у рэстаранах больш рэспектабельных — да 20 працэнтаў. На Канарскіх астравах сума «чаявых» за ўсе паслугі складае па мясцовых звычаях 10—12 працэнтаў. У іспанскіх кафэ і рэстаранах перад тым, як даваць чаявыя, трэба праверыць, ці не ўключаны 15-працэнтны падатак за абслугоўванне ў ваш рахунак. Калі не, тады звычайна да сумы рахунку дабаўляецца яшчэ 10 працэнтаў. Вадзіцелям таксі ў Іспаніі «чаявыя» даваць наогул не прынята. Сярэдняя сума чаявых у атэлях і рэстаранах на Балеарскіх астравах складае 5—10 працэнтаў ад рахунку. У Ізраілі традыцыйна прынята выказваць падзяку персаналу атэля, гіду або вадзіцелю, якая выражаецца ў наступных размерах: у аўтобусных турах — каля 1 долара для гасцінічнага персаналу ў дзень, — 4 долары — для гіда; у турах на ўласным аўтамабілі — 1 долар персаналу атэля і 5—10 долараў гіду або вадзіцелю (калі машына арандуецца). У Злучаных Штатах Амерыкі, з якіх мы так любім браць прыклад, афіцыянтам у кафэ і рэстаранах прынята даваць чаявыя ў размеры 15 працэнтаў ад сумы рахунку.

ЧАЛАВЕК ПА-ЗА ПАЛІТЫКАЙ

BABY SITTER (НЯНЬКА) —

ДОБРАЯ РАБОТА НА ЗАХАДЗЕ ДЛЯ БЕЛАРУСКІХ СПАДАРЫНЬ З ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫЯЙ?

Яна пазваніла за дзень да «Прамой лініі» чытачоў са Старшынёй Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь Станіславам Шушкевічам, баючыся не дазваніцца ў час яе правядзення. Выклаўшы сутнасць пытання, дзяўчына прасіла перадаць яго кіраўніку рэспублікі. Яно было не падобнае на іншыя. Я папрасіў яе прыехаць у рэдакцыю. Праз гадзіну Марына ЯНЧАНКА (менавіта так прадставілася дзяўчына) была ў маім кабінеце.

Прыгожыя доўгія косы, вялікія чорныя вочы, сучаснае адзенне... Няўжо, падумалася, гэтая маладая асоба не знойдзе сябе тут, на радзіме, што імкнецца за кардон. Але Марына настойвала на сваім:

— Хачу, каб Шушкевіч дапамог паехаць на заработкі ў ЗША ці ў Канаду. Мая сяброўка Галіна там ужо некалькі месяцаў. Працуе нянькай, зарабляе, паводле яе слоў, «добра». Мне таксама хацелася б працаваць там.

— Але ж гэта не ў кампетэнцыі Старшыні Вярхоўнага Савета...

— Іншыя ж едуць?! Ці ж я не такая, як усе, — з адчаем гаварыла Марына. — У мяне бацькі жывуць у вёсцы, на Магілёўшчыне. Навучылі працаваць. Я змагла б там знайсці сябе, не прапала б.

— Прабач, калі ты ўмееш і любіш працаваць, дык і тут не прападзеш, — пераконваў я сваю субяседніцу. — Маладыя разумныя людзі рэспубліцы патрэбны.

— Што вы гаворыце? Хапугі і жулікі патрэбны, а хто сумленны — прапаў, — спрачалася дзяўчына.

— І ўсё ж падумай, Марына. Станіслаў Станіслававіч не вырашыць тваё пытанне.

— Значыць, не перадасціце яго яму?

— Перадам, чаму ж. Толькі павер: у тых, амаль за сотню, пісьмах і званках, якія паступілі ўжо на «Прамую лінію», сапраўды балючыя пытанні, як асабіста для людзей, так і для Беларусі ў цэлым. Баюся, што...

Зазваніў тэлефон, і папку з пісьмамі і званкамі чытачоў «Звязды» я паклаў перад Марынай. Большасць з іх яна прагледзела.

— А ведаеце, у ЗША і Канадзе, як сцвярджае сяброўка, вельмі не хапае нянек, — зноў павяла сваё Марына.

Чым жа займаецца там яе сяброўка? Думаю, нашым чытачам цікава будзе даведацца пра гэта са слоў Марыны.

— А дзе працуе Галіна?

— У штаце Каліфорнія, у ЗША. Там шмат ужо дзяўчат з Польшчы, ёсць і з Расіі. Праз іх і апынулася там Галя. Дарэчы, сям'я, дзе яна працуе, вельмі прыемная гаспадыня — менеджэр, гаспадар — пісьменнік.

— Пашанцавала, мабыць, тваёй сяброўцы?

— Лепш і не прыдумаеш. Працоўны дзень пачынаецца а восьмай гадзіне раніцы. Рыхтуе дзецям для школы штосьці падобнае на сэндвічы, сок, фрукты, бананы. Пяцігадовых Джорджа і Скота сяброўка адвозіць у школу.

— Яна ўмее кіраваць машынай?

— Жыццё навучыла. Пасведчанне на кіраванне аўтамабілем? Канешне, неабходна. Галіна яго атрымала ўжо там. Гаварыла, што значна лягчэй гэта было зрабіць, чым у нас. Замест 800 пытанняў усяго 50, і зусім элементарныя. Падкупляць інструктараў не трэба. Так што яна «ліхачыць» на «хондзе». Праўда, скардзіцца, што такія паездкі — сапраўдная пакута: дзеці націскаюць на ўсе рычагі і кнопкі. Асабліва стараецца гадавалы Арнольд.

— Цікава. З пяці гадоў у школу...

— Мяне гэта таксама крыху здзівіла. Але Галіна растлумачыла: гэта штосьці накшталт нашай старэйшай групы дзіцячага садка. Яны там вучацца з 8.30 да 12.00. Чым займаюцца пасля школы? Да прыходу бацькоў — шасці вечара— сядзяць дома, калі-нікалі ідуць у заапарк, у парк. Але больш за ўсё, расказвала Галя, як і нашы дзеці, любяць глядзець «відзік». Нават маленькі Арнольд дзве-тры гадзіны вытрымлівае. Можа таму, што там мультфільмы цікавейшыя і больш павучальныя, чым у нас, напрыклад, пра мядзведзяў гамі.

— І так кожны дзень? Не сумна?

— Магчыма. Але хто любіць дзяцей — гэта цікава. Напрыклад, Галіна яшчэ сочыць, каб дзеці не вываліліся з акна, не зламалі сабе ногі-рукі і не совалі пальцы ў разеткі. Акрамя таго, яна часта карыстаецца пральнай машынай: дзеці ёсць дзеці. Добра яшчэ, што яны не пераборлівыя, аддаюць перавагу хот догу, гамбургеру ці чыкен нагетсу (курыным катлетам), кансервам. Нават самы маленькі, як расказвае Галіна, не любіць бэбі-фуд (дзіцячае харчаванне) і патрабуе ўжо кока-колу і смажаную бульбу. Правільна там робяць: дзецям у школе не задаюць хатніх заданняў, а калі і задаюць, дык вельмі простыя.

— Марына, ты ўсё так падрабязна распавядаеш. Такое ўражанне, што ты толькі што вярнулася з Амерыкі? — заўважыў я.

— Што вы, — засмяялася Марына, — проста, сяброўка часта пісьмы дасылае, звоніць, а нядаўна я атрымала пасылку з адзеннем. Праўда, ...здалося яно мне паношаным.

— Яна, Галіна, задаволена?

— Не ведаю. Але жыллё і яда ёсць, ды яшчэ і плацяць — што яшчэ трэба? Піша, што не збіраецца ўвесь час працаваць нянькай. Марыць сабраць грошай і паступаць у адзін з універсітэтаў.

— Не буду агітаваць цябе, Марына, але, здаецца, не так усё проста, як табе ўяўляецца. Ты не задумвалася, чаму так часта піша і звоніць твая сяброўка? Там таксама ёсць свае праблемы. У нас свае. Многія з іх адлюстраваны ў гэтых вось дописах і званках у рэдакцыю, з якімі ты пазнаёмілася.

— І сапраўды, у людзей шмат праблем. У мяне ж свая. Ад сваёй мары не адступлюся, а Шушкевічу мае асабістае пытанне не перадавайце. Хаця...

Што ж, сяброўка Марыны, мабыць, нядрэнна ўладкавалася, чаму і пазайздросціла дзяўчына і захацела сама такім спосабам «падзарабіць». Магчыма, прачытаўшы гэты матэрыял, стануць на яе бок і многія іншыя маладыя грамадзяне нашай рэспублікі. І іх можна ў нейкай меры зразумець: нам яшчэ працаваць і працаваць, каб быць задаволенымі вынікамі нашай працы.

І ўсё ж пасля размовы з Марынай Янчанка невясёлыя думкі ўзніклі. Першая — аб праблеме аплаты працы і выхавання дзяцей. «Там», калі ты працуеш, то і атрымліваеш, і жывеш добра. У нас жа, хоць і працуеш, атрымліваеш вельмі мала. Хапіла б на жыццё... Таму многія бацькі больш думаюць пра работу, а не пра выхаванне дзяцей, якія, пакінутыя сам-насам, на «тэлефоннае выхаванне» ўжо не рэагуюць. Але, з другога боку, што лепш — загрузіць дзяцей спартыўнымі секцыямі, урокамі музыкі, паходамі ў музеі ці прадаставіць іх выхаванне самому жыццю (ці відзіку)? Развіваць іх узмоцнена ці няхай свабодна развіваюцца самі?

Другой думкай было разважанне пра тое, як небяспечна для рэспублікі губляць маладых, здаровых, разумных, прыгожых, як Марына, юнакоў і дзяўчат. Многія, і гэта ведаюць улады, глядзяць на Захад, а некаторыя ўжо шукаюць там сваё шчасце. Калі ўцякае моладзь, значыць грамадства, у якім мы жывём, вельмі хворае. А што нас чакае пасля прыняцця закона аб выездзе? Мы будзем губляць будучыню. У свой час Амерыка, Францыя, Германія імкліва ішлі ўгору, аб'яднаўшы сваіх людзей ідэяй свабоды, ідэяй адраджэння. Настаў такі час і для Беларусі: ніхто за нас не зробіць лепшым наша жыццё, толькі самі мы здольныя адрадзіць і ўзбагаціць сваю Бацькаўшчыну. Але без моладзі крочыць наперад нельга. Усвядоміць гэта павінны і палітыкі, і гаспадарнікі, і бацькі юнакоў і дзяўчат. Усім нам трэба абудзіць у сэрцах маладых любоў і павагу да сваёй Айчыны, даць ім надзею і ўпэўненасць у будучым, паказаць, што роскві[т] роднай зямлі немагчымы без розуму і рук тых, хто толькі ўступае ў вялікае жыццё. А пакуль маладыя глядзяць на Захад...

Уладзімір АНДРЫЕВІЧ.

З днём нараджэння!

Савет Міністраў Беларусі прыняў пастанову аб стварэнні ў структуры цэнтральнага апарату Міністэрства транспарту Упраўлення марскога гандлёвага флоту. У сувязі з гэтым колькасць работнікаў апарату міністэрства павялічваецца на 10 адзінак.

З мэтай інтэнсіфікацыі работ у галіне зваркі і ахоўных пакрыццяў і павышэння ўзроўню навукова-метадычнага кіравання гэтымі работамі ўрад рэспублікі прыняў пастанову аб стварэнні ў складзе Беларускага рэспубліканскага навукова - вытворчага аб'яднання парашковай металургіі на базе яго інжынернага цэнтра ахоўных пакрыццяў Навукова - даследчага і канструктарска-тэхналагічнага інстытута зваркі і ахоўных пакрыццяў (з правам юрыдычнай асобы). Вызначаны асноўныя напрамкі дзейнасці новай установы.

«Ілля жніво пачынае, а лета канчае»

У нядзелю — Ілля, адно з самых шануемых хрысціянскіх святаў.

Святы прарок Ілля згодна з народным паданнем, быў узяты жывым на вогненнай калясніцы ў неба. Паводле хрысціянскіх уяўленняў, ад святога Іллі залежаць дажджы, а значыць, і ўраджай. Каб не прагнявіць яго, у гэты дзень стараліся нічога не рабіць. Ад Іллі пачыналася звычайна доўгачаканае жніво: «Святы Ілля — слаўная жняя». Адначасова са жнівом ідзе падрыхтоўка да сяўбы азімых, узвоўваецца пожня: «Па Іллі хоць адным зубам зямлю капні». Гэты дзень успрымаецца як рубеж паміж летам і восенню: «На Іллю да абеду лета, а па абедзе — восень».

Бортнікі назіралі за пчалінымі раямі: калі яны выйшлі да Іллі, то былі надзейныя, калі ж не, іх лепш было адпускаць, а не асаджваць.

Малюнак А. ЧУБУКІНА.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

Праваслаўная хрысціянская абшчына пасёлка Мухавец Брэсцкага раёна звяртаецца з просьбай аб аказанні матэрыяльнай дапамогі для будаўніцтва Свята - Уладзімірскай царквы Дружбы народаў (у замен разбуранай у час вайны) у пасёлку Мухавец Брэсцкага раёна.

Паважаныя суайчыннікі, грамадзяне Рэспублікі Беларусь, калектывы заводаў і фабрык, кааператываў, калгасаў і саўгасаў, іншых прадпрыемстваў і цэркваў, акажыце хоць бы нязначную дапамогу. **Наш разліковы рахунак 000701104 у Акцыянерна-камерцыйным Белаграпрамбанку г. Брэста або па адрасу: 225006, Брэсцкі раён, п/а Мухавец. Свята-Уладзімірская царква.**

Няхай благаславіць гасподзь Вас і Вашых дзяцей.

Свяшчэннік Мікалай БРАЛЮК.

Усе дарогі вядуць да прыватызацыі

Апошнім часам нас стараліся прымусіць паверыць, што дарога да рынку ідзе праз гіперінфляцыю або, у лепшым выпадку, праз прыватызацыю кватэр, дробных, як правіла, стратных магазінаў і рэстаранаў, работнікі якіх не могуць наладзіць забеспячэнне старымі метадамі.

Другое няправільнае ўяўленне аб механізме ўзнікнення рынку звязана са спробамі сказіць узаемаадносіны прыватызацыі і рынку, паказаць, што спачатку мы ствараем рынак, а затым ужо ажыццяўляем прыватызацыю. На самай справе ўсё наадварот. Рынак магчымы толькі ва ўмовах прыватнай уласнасці, г. зн. пасля раздзяржаўлення эканомікі.

Неабходныя ж і абавязковыя ўмовы для ўсталявання рынку ствараюцца толькі пры ўмове прыватызацыі не столькі асабістай і дробнай уласнасці, колькі буйной. Ці не маглі б вы расказаць пра асноўныя паняцці і падыходы да прыватызацыі?

Васіль ПЕЧНІКАЎ.

г. Гомель.

За тлумачэннямі мы звярнуліся да юрыста Уладзіміра ПЕТУХОВІЧА:

АСНОЎНЫЯ ПАНЯЦЦІ ПРЫВАТЫЗАЦЫІ.

Раздзяржаўленне — паняцце больш шырокае, чым прыватызацыя, яно прадугледжвае перадачу маёмасці з дзяржаўнай уласнасці ў іншую: муніцыпальную, прыватную, калектыўную, кааператыўную, акцыянерную, змешаную.

Прыватызацыя — адзін з відаў раздзяржаўлення, які з'яўляецца пераходам уласнасці менавіта ў прыватныя рукі.

Муніцыпалізацыя — дэцэнтралізацыя дзяржаўнай улады, набліжэнне яе да патрэб і патрэбнасцей насельніцтва.

Адрозніваюць чатыры асноўныя формы раздзяржаўлення і прыватызацыі маёмасці:

АРЭНДА (уласнік не мяняецца, але мяняецца ўладальнік, карыстальнік маёмасці), **ЛІЗІНГ** (як правіла, у нашай краіне гэта арэнда з наступным выкупам. Па сутнасці, гэта продаж маёмасці ў крэдыт, з растэрміноўкай плацяжу), **КОНКУРС** (продаж маёмасці найбольш дастойным і прафесіянальна граматным уладальнікам), **АЎКЦЫЁН** (продаж таму, хто больш можа заплаціць).

Арэнда — найбольш выгадная форма раздзяржаўлення для мясцовых улад. Яны атрымліваюць грошы за арэнду і не турбуюцца пра арганізацыю гандлю, абслугоўвання або вытворчасці. Адначасова ўлады захоўваюць кантроль і ў пэўнай ступені адміністрацыйны ўплыў на арандатара, што нярэдка выліваецца ў асабістую, паўфеадальную залежнасць арандатара з усімі адсюль вынікамі.

Лізінг (арэнда з выкупам)— спроба прымірыць інтарэсы арандатара і арэндадаўца. Працягласць тэрміну арэнды не дазваляе ўладам мяняць яе ўмовы і ўразае адміністрацыйнае самавольства. Арандатар у такой сітуацыі заўсёды ў няпэўным становішчы — ён не ведае, каму канкрэтна будзе належаць маёмасць пасля завяршэння тэрміну арэнды (працоўнаму калектыву, чый састаў мяняецца, кіраўніку, які наладзіў усю справу, ці таму, хто ўнёс у канцы тэрміну арэнды выкуп?).

Конкурс — самая выгадная форма для працоўных калектываў або прадпрымальных людзей і самая нявыгадная для мясцовай улады. Тыя, хто можа даказаць эфектыўнасць выкарыстання маёмасці, атрымліваюць яе дастаткова танна або нярэдка амаль дарэмна. Улады ж у даным выпадку маюць грошы, якіх зусім недастаткова для папаўнення дэфіцыту бюджэту.

Пры конкурсу магчымыя пратэкцыянізм і карупцыя, асабліва калі ён будзе адбывацца не масава, а ў індывідуальным парадку.

Аўкцыён — форма самая выгадная для ўлады з пункту гледжання папаўнення бюджэту і самая нявыгадная для працоўных калектываў, занятых на прыватызуемых прадпрыемствах. З пункту гледжання грамадства аўкцыён пры масавым яго правядзенні забяспечвае максімальную эфектыўнасць для народнай гаспадаркі — ён дае прыток сродкаў у дзяржаўную казну, стабілізуе грашовую масу (адцягвае з абарачэння вялікія грашовыя рэсурсы), забяспечвае максімальна эфектыўную работу прадпрыемства. Рэнтабельнасць прыватызуемага прадпрыемства практычна гарантавана, бо тыя, хто заплаціў на аўкцыёне вялікія гошы, зробяць усё, каб аб'ект прыносіў прыбытак. Такім чынам, бюджэт будзе атрымліваць вялікія паступленні не толькі ў момант прыватызацыі, але і на працягу ўсяго яго функцыяніравання — у выглядзе падаткаў на прыбытак. Гэта форма прыватызацыі найбольш прывабная для самых прадпрымальных і энергічных людзей. Яна адпавядае інтарэсам як айчыннага, так і замежнага інвестара.

Муніцыпалізацыя ў шэрагу выпадкаў дазваляе дасягнуць умераных станоўчых вынікаў проста дзякуючы рэарганізацыі і ў сілу гэтага невялікага ажыўлення (праўда, часцей за ўсё часовага) — ініцыятывы калектыву. Пры гэтым муніцыпалізацыя, па сутнасці, пакідае на прадпрыемстве практычна ўсё, як было, і стварае толькі бачнасць прагрэсіўнага руху.

ІСНУЮЦЬ ЧАТЫРЫ АСНОЎНЫЯ ПАДЫХОДЫ ДА ПРЫВАТЫЗАЦЫІ:

1. **Канцэпцыя гістарычнай справядлівасці** — палітыка дэкамунізацыі шляхам вяртання ўласнасці былым законным уладальнікам (атрымлівае практычнае развіццё ў Латвіі).

2. **Канцэпцыя сацыяльнай справядлівасці** — раздзяленне дзяржаўнай уласнасці паміж усімі грамадзянамі краіны незалежна ад іх удзелу ў канкрэтнай вытворчасці (у шэрагу выпадкаў з надзяленнем сертыфікатамі ў адпаведнасці з працоўным стажам) — сучасны варыянт сацыялістычнай ідэі ўсеагульнай справядлівасці і раўнапраўя.

3. **Канцэпцыя дзяржаўнай неабходнасці** — выкуп асноўных вытворчых фондаў калектывамі прадпрыемстваў. Такая прыватызацыя, па сутнасці, пакідае непарушнымі ўладу і дабрабыт адміністрацыйна-каманднай сістэмы. У лепшым выпадку адбудуцца невялікія змены ў персаніфікацыі гэтай улады.

4. **Канцэпцыя кампраміснага падыходу** — уласнікамі могуць выступаць як фізічныя асобы, працоўныя калектывы, так і юрыдычныя— грамадскія, дзяржаўныя, прыватныя арганізацыі.

Вядома, што радыкальныя варыянты заўсёды вялі да гістарычнага тупіка. Кампрамісны варыянт можа забяспечыць спалучэнне інтарэсаў унутраных і знешніх інвестараў, ініцыятывы і калегіяльнасці прыняцця рашэння, прывесці да станаўлення рынку каштоўных папер і эфектыўнага функцыяніравання фондавых біржаў.

Мы паедзем— паімчым. У Польшчу, Турцыю і нават далей

ГОМЕЛЬ. (У. Пернікаў). Пракуратура вобласці правяла праверку выканання заканадаўства ў сувязі са шматлікімі замежнымі паездкамі грамадзян. Выяўлена нямала яго парушэнняў.

На многіх прадпрыемствах у табелях уліку рабочага часу пры такіх вояжах людзям выстаўляліся поўныя рабочыя дні і выдавалася зарплата. Кіраўнікі тлумачылі гэта тым, што, маўляў, людзям прадастаўляліся адгулы за раней адпрацаваныя святочныя ці выхадныя дні, хоць яны нідзе не рэгістраваліся. Неабгрунтавана таксама даваліся адгулы за звышурочныя работы, бо гэта забаронена законам.

Дырэктарам шэрагу прадпрыемстваў, арганізацый і ўстаноў было прапанавана ў добраахвотным парадку за кошт вінаватых аднавіць нанесеныя страты. Толькі ва універмагу «Гомель» 25 работнікаў унеслі ў касу звыш дзевяці тысяч рублёў. А ў некалькіх выпадках за грубае ігнараванне заканадаўства і парушэнне мытных правіл узбуджаны крымінальныя справы.

Толькі ці спыняць гэтыя меры паток нашых суайчыннікаў за мяжу, дзе, калі шчыра, хоць трохі, усё ж можна падзарабіць?

Усходні гараскоп на наступны тыдзень

З Дэлі паведамляе кар. ІТАР—ТАСС Сяргей БУЛАНЦАЎ.

ХОЧАЦЕ — ВЕРЦЕ, ХОЧАЦЕ — ПРАВЕРЦЕ

Астролаг рэкамендуе КАЗЯРОГУ быць пастаянна напагатове дома і на рабоце. Вы моцна загружаны неадкладнымі справамі. Карыстаючыся гэтым, нехта старанна спрабуе атруціць атмасферу ў вашай сям'і. Служачага могуць перавесці ў зону канфлікту. Не выключаецца іскрамётны раман. Даме трэба задумацца, чаму ваш паклоннік так настойліва дамагаецца знаёмства з вашым мужам.

ВАДАЛЕЯ нейкая цёмная асоба паспрабуе падмануць на вялікую суму. Устрымайцеся ад імпульсіўнага ўчынку 5 жніўня. На рабоце пачынаецца цяжкі час, які прадоўжыцца два тыдні. Пастарайцеся завязаць карысныя кантакты. Няхай будзе светлай журба ад разлукі з любімым чалавекам, бо яна чысціць вашу душу.

РЫБЫ ўдала мінуюць расстаўленыя на іх пасткі і выбіраюцца на строму поспеху. Вы праявіце выдатную працавітасць. Служачыя атрымаюць адказнае заданне, на выкананні якога трэба гранічна сканцэнтравацца. Калі дзяўчына жыве з бацькамі, магчыма прапанова рукі і сэрца з-за мяжы. У адзінокай і безабароннай з'явіцца занадта мэтанакіраваны кавалер.

АВЕН, які займаецца бізнесам, апынецца на раздарожжы. Планеты дапамогуць прыняць правільнае рашэнне 3 ці 6 жніўня. Не дапускайце адступленняў ад вытворчай дысцыпліны нават з самымі добрымі намерамі. Падвойце пільнасць, калі працуеце ў банку ці звязаны з купляй-продажам: вас спрабуюць уцягнуць у падазронае мерапрыемства. Калі дзіця капрызіць, пакажыце яго ўрачу. Закаханыя часова разлучаны.

Уласцівыя ЦЯЛЬЦУ сіла і энергія дапамагаюць выбрацца з паласы няўдач. Новая работа, якую вы пачняце 3 ці 4 жніўня, прынясе добрыя дывідэнды. У абцяжараных сямейнымі праблемамі працуючых жанчын усё не так гладка. Ваш муж можа застацца без работы ці зведае буйныя фінансавыя страты. На вас кладзецца двайная ноша. Не ператварайцеся ў мегеру, і тады ўсё абыдзецца.

На небасхіле БЛІЗНЯТ планеты размяшчаюцца спрыяльна для новага пачынання ці ад'езду ў камандзіроўку. Важная сустрэча ці нарада 4 жніўня моцна паўплывае на ваша далейшае жыццё і кар'еру. Наступальная пазіцыя на дзелавых перагаворах дапаможа дасягнуць поспеху. Працуеце звышурочна — смела патрабуйце прыбаўкі да зарплаты. Сямейны канфлікт вырашыцца хутчэй, чым вы думаеце. Моцна засмуціць нечаканае спатканне са старым каханнем.

РАК наўрад ці пазбегне наганяю ад патрона за рассеянасць. 6 і 7 жніўня можаце адчуваць сябе дастаткова ўпэўнена —гэта вашы лепшыя дні. Затузаныя жанчыны рызыкуюць не заплаціць своечасова па рахунках — не адключылі б у вас ваду ці тэлефон. Ваеннаслужачага замест чакаемага павышэння загоняць туды, куды крумкач касцей не насіў. Закаханы чалавек крыўдуе без дай-прычыны.

ІЛЬВУ трэба праявіць велічную мудрасць і добра пралічыць хады наперад. Будзе спроба адцягнуць вашу ўвагу ад пастаўленых мэт. Пазбягайце балбатуноў і тых, хто мякка сцеле ды жорстка спаць кладзе. 4 жніўня не выключаны хатнія праблемы, у справах давядзецца паспадзявацца на калегу ці партнёра. З каханым чалавекам будзеце мець зносіны ў асноўным па тэлефоне.

Верагодна, ДЗЕВА завершыць распачатую раней работу, якая будзе няблага аплачана. Астролаг мяркуе, што вы прададзіце частку непатрэбнай вам маёмасці. Нядаўняе каханне натыкаецца на рыфы адчужанасці і неразумення. Паспрабуйце шчыра пагаварыць пра ўсё. Мілая дама, калі паклоннік ужо больш году тлуміць вам галаву і дагэтуль не пазбавіўся ад алергіі на вясельны марш Мендэльсона, ганіце яго.

Напружаная праца мінулага тыдня прынясе ШАЛЯМ добрыя весткі 5 ці 6 жніўня. Вецер удачы напаўняе ветразі вашых пачынанняў. Служачы, які падрыхтаваўся да звальнення, атрымае павышэнне. Блізкі сябар акажа каштоўную дапамогу. Нячысты на руку бізнесмен абавязкова прагарыць. Магчымы доўгачаканы раз'езд са старэйшымі сваякамі. Не выключана неразумная спрэчка з-за глупства.

Планеты загадваюць СКАРПІЁНУ пайсці на рызыку — яна апраўдаецца. Важна прыняць валявое рашэнне — далей усё пойдзе лёгка. Многія шчыра хочуць супрацоўнічаць з вамі. Часова беспрацоўныя будуць працаўладкаваны. Магчыма паездка на поўдзень ці ў горы. Дамашнія заўважаюць у вас дыктатарскія схільнасці. 4 і 9 жніўня будзьце ўдвая пяшчотныя і ласкавыя.

СТРАЛЬЦУ 4 і 5 жніўня адведзены для абмеркавання ўсіх важных пытанняў. Адказнае рашэнне, прынятае ў гэтыя дні, створыць доўгую спрыяльную перспектыву. Не адмаўляйцеся ад ранейшых планаў, але праявіце гібкасць у іх рэалізацыі. Разведзеныя знойдуць новае каханне, якое ўвянчаецца трывалым і шчаслівым шлюбам. Маладыя жонкі, памятайце, што вы надзвычай схільныя да зачацця.

На замок спачатку рот

Ваша газета надрукавала шэраг даволі цікаўных артыкулаў палкоўніка міліцыі Валерыя Струмбурскага аб тым, як можна папярэдзіць кватэрны крадзеж. Але нядаўна даведаўся, што майго знаёмага не ўратавалі ніякія замкі — зладзеі вынеслі з кватэры амаль усё каштоўнае. Ці не маглі б вы прывесці яшчэ хоць бы адзін спосаб застрахавацца ад кватэрных крадзяжоў?

Н. ПАРМОН.

г. Светлагорск.

На пытанне чытачкі адказвае старшы следчы УУС Мінгарвыканкома Леанід ЗАГДАЙ:

— На прыкладзе адной з крымінальных спраў можна расказаць пра тое, як пацярпеўшыя, у літаральным сэнсе, правакуюць учыненне гэтага злачынства ў адносінах да сябе.

«Мой дом — мая крэпасць». Як жа адчыняецца гэтая крэпасць? Нехта В. Барсукоў арганізаваў устойлівую злачынную групу з 17 чалавек, з якімі на тэрыторыі Заводскага, Ленінскага раёнаў г. Мінска ўчыніў 27 крадзяжоў і рабаванняў з кватэр. Што ж дапамагала В. Барсукову знаходзіць аб'екты сваёй работы, калі сума выкрадзенага за 1991 год дасягнула 20 і больш тысяч рублёў. Перш за ўсё, паводзіны пацярпеўшых.

Набыўшы відэамагнітафон, пацярпеўшы К. здаваў яго напракат, пра што стала вядома Барсукову, які разам са сваімі хлопцамі ўзламалі яго кватэру і выкралі відэамагнітафон і іншую маёмасць на агульную суму звыш 6 тысяч рублёў. У гэтым выпадку ўчыненню крадзяжу спрыялі паводзіны пацярпеўшага, які імкнуўся да асабістага абагачэння.

Пацярпешы Л., пазнаёміўшыся з абаяльнай Захаравай у рэстаране, запрасіў яе да сябе дадому, дзе апошняя, убачыўшы багатае ўбранне кватэры, адважылася на ўчыненне крадзяжу, а рэалізацыю гэтага плана прапанавала Кумагерчыку і Барсукову.

Пацярпеўшая С., пакутуючы ад адзіноцтва, у пошуку кампаньёнаў для выпіўкі, прыходзіла да вінна-гарэлачных аддзелаў, дзе пазнаёмілася з Кісельнікавай і Барсуковым, якія двойчы ўчынялі крадзяжы ў яе кватэры.

Пералічаныя прыклады паказваюць, што часта прычынай крадзяжоў у канкрэтнага чалавека з'яўляюцца неабдуманыя паводзіны са знаёмымі, сябрамі і чужымі асобамі. Так што, перш чым распавядаць пра свой дабрабыт незнаёмым людзям, задумайцеся: ці варта?

НАВЕЙШАЯ ГІСТОРЫЯ. УСПАМІНЫ І РОЗДУМ

Міхаіл ЗІМЯНІН: «У 70-Х МЫ МЕЛІ ЎСЁ, АКРАМЯ АДНАГО— ПАЛІТЫЧНАЙ ВОЛІ»

(Працяг. Пачатак у №№ 150, 151).

Разумны, здатны, у многіх адносінах безумоўна прыстойны, гаспадар свайго слова і да пары да часу добразычлівы чалавек, ён з тых людзей, якія аптымістычна зараджаюць. Але гады работы ў Камітэце дзяржбяспекі вельмі моцна змянілі Андропава.

— На Лубянцы ён прабыў гадоў дзесяць?

— Нават больш. Гэты час зрабіў яго больш жорсткім, больш насцярожаным, непрымірымым, выхаваў нейкія негатыўныя якасці, якія спачатку былі скрытыя — бо ён якіх-небудзь асаблівых рэпрэсій не дапускаў, няма ў яго славы карніка, але гэтая служба ўсё ж зрабіла яго не толькі аб'ектыўным, але і непрыемна жорсткім, да непрымальнага. Калі, напрыклад, новы Генсек зразумеў, што ў атмасферы брэжнеўскага застою і дабрадушнасці дысцыпліна рэзка ўпала, ён запатрабаваў — зусім правільна — рэзкага змянення. Але даходзіла да анекдатычнага: лавілі прагульшчыкаў у кінатэатрах, магазінах...

На жаль, работа ў КДБ давала Андропаву арыенціроўку ва ўсіх негатыўных момантах, ён добра ведаў небяспечную абстаноўку ў краіне, але яна ж пазбаўляла яго практычнага вопыту па ажыццяўленню пераўтваральных мер. Для таго каб кіраваць, трэба ведаць, як гэта робіцца, неабходны адпаведны вопыт. Не ведаючы самалёт, лётчык не бярэцца яго пілатаваць. А ў нас многія палітыкі браліся, а цяпер нават асабліва завіхаюцца ў дзяржаўным кіраванні, не маючы ў ім ніякага вопыту. І тым не менш яны ўпэўнены, што могуць! Я ўжо не гавару пра хлопчыкаў ад эканомікі з кандыдацкімі і докторскімі званнямі, звярнуся да прыкладу акадэміка: Шаталін ніколі не меў ніякага вопыту кіравання дзяржавай, але абвясціў сябе кіраўніком дзяржаўнай эканамічнай школы, што рвецца да перабудовы. Калі цяпер ён пераканаўся ў поўным банкруцтве сваёй 500-дзённай «праграмы», дык піша дыяметральна процілеглае таму, што гаварыў учора. Ну проста дзіва!

Дарэчы, вернемся да Андропава. Дык вось, ён, аналагічна, не меў належнага практычнага вопыту: ён назіраў, ён удзельнічаў збоку, змагаўся, так сказаць, са знешняй і ўнутранай контррэвалюцыяй, гэта ўсё правільна. Але ў яго не было, паўтараю, багажу, раўнацэннага таму, напрыклад, якім валодаў Касыгін, ці Усцінаў у сферы абароны — гэта буйнейшыя арганізатары. Ці ўзяць Даўгіх — сакратар ЦК, кандыдат у члены Палітбюро, які не спадабаўся Гарбачову. А ён жа вельмі таленавіты арганізатар цяжкай індустрыі! Вельмі яркі чалавек з вялізным вопытам кіравання адышоў у бок, дакладней, яго «адышлі»...

У Андропава, паўтару, такія неабходныя якасці адсутнічалі. І ў гэтым плане яго смерць у выніку хваробы была заканамернай... Паўтару: не хачу яго абгаворваць, мы доўга сябравалі, хоць у канцы жыцця я не змог пагадзіцца з некаторымі прынцыповымі рэчамі, якіх ён прытрымліваўся, і ў адносінах наступіў разрыў...

— Ці дапускаў Андропаў магчымасць спрэчкі з субяседнікам на аднолькавых правах?

— Так, канешне. Але апошнія слова пакідаў, натуральна, за сабой. Натуральна з пункту гледжання той сістэмы кіравання, якая была ў нас.

Адхілюся на імгненне ўбок. Майце на ўвазе: я нашу сістэму кіравання, пачынаючы ад Леніна, лічу аўтарытарнай. У Леніна гэты аўтарытарызм ідзе ў сілу велізарнага, на парадкі вышэй за акружаючых яго людзей, інтэлекту, волі і зноў жа вопыту арганізатара ў гіганцкіх маштабах, з якімі нічога не можа параўнацца. Ён чалавек стагоддзя ў літаральным сэнсе гэтага слова, што б пра яго цяпер ні гаварылі, як бы яго ні паказвалі, як бы з яго ні здзекваліся... Усе, хто цяпер вымазваюць яго чорнай фарбай, пігмеі ў параўнанні з ім.

Але, на жаль, праўда такая, што аўтарытарная сістэма кіравання пачалася менавіта з Леніна. Але тады гэта тлумачылася сілай яго аўтарытэту, хоць з ім і спрачаліся, нават дыскуціравалі, напрыклад, па Брэсцкаму міру, па прафсаюзах, па фарміраванню Савецкага Саюза... Апаненты, аднак, разумелі: перад імі махіна, глыба, і ў канчатковым выніку адступалі. З усмешкай ці без яе, з прабачэннямі ці без іх, але ўсё роўна схіляліся перад сілай асобы Леніна. Менавіта такі ленінскі аўтарытэт і заклаў тую аснову аўтарытарызму, якую Сталін узвёў у прынцып тыраніі, дэспатызму, асабістай дыктатуры, ператварыўшы кіраўніцтва краінай у тыранічнае.

Хоць такім яно было не заўсёды, не. Сталін ішоў да гэтага на мяжы 20—30-х гадоў ва ўмовах унутрыпартыйнай барацьбы. Ён перамог сваіх апанентаў паслядоўнымі, няўхільнымі, жалезнымі, я сказаў бы — і каварнымі, і подлымі, і жорсткімі, страшэнна жорсткімі, тэарыстычнымі метадамі, у выніку якіх перыяд сталінскага кіраўніцтва можна назваць перыядам нейкай сталінскай д'ябаліяды. Нехта з паэтаў назваў яго вурдалакам. Вельмі дакладна!

Сталін зацвердзіў аўтарытарную сістэму, хоць дакументальна ўсё афармлялася такім чынам, быццам яна дэмакратычная, ленінская, паслядоўная, калектыўная і г. д. На самай жа справе размову трэба весці пра вельмі жорсткую, але старанна скрытую дыктатуру.

Хрушчоў, што падверг крытыцы культ Сталіна, так і не здолеў замахнуцца на сталінскі рэжым дыктатуры, на рэжым аўтакратычнага, аўтарытарнага кіравання краінай, партыяй і дзяржавай — ён, заўважце, гэты рэжым не крануў. Таму, калі гаварыць пра вялікую заслугу Хрушчова як адкрывальніка новай эпохі, змагара, што зламаў хрыбет сталінізму, дык я павінен сказаць наступнае. Так, у асабістай мужнасці гэтаму чалавеку адмовіць нельга, як нельга, напрыклад, адмовіць яму і ў яго ініцыятыве выкрыцця Берыя, у крытыцы культу... Павінен, праўда, агаварыцца, што падвяргаючы Сталіна крытыцы за рэпрэсіі, Хрушчоў тым самым у нейкай меры замольваў уласныя грахі, таму што ён у гэтых рэпрэсіях удзельнічаў і як сакратар МГК, і як сакратар Кампартыі Украіны. Я ведаю людзей, яны жывуць і цяпер, на якіх Мікіта Сяргеевіч падпісваў заключэнні аб неабходнасці арышту...

Пасля Хрушчова і крытыкі яго валюнтарызму, суб'ектывізму, парушэння прынцыпаў калектыўнага кіраўніцтва да ўлады прыйшоў Брэжнеў. Вось вам і доўгачаканая калектыўнасць, усё дружна, весела, але ж фактычна аўтарытарная сістэма кіравання працягвала жыць!

У тым, што наспела к 85-му году, была таксама неабходнасць ліквідацыі гэтай сістэмы кіравання і ў партыі, і ў дзяржаве.

«ПАМЫЛКІ ПАЧАЛІСЯ НЕ СА СТАЛІНА, ІХ АДЛІК ВЯДЗЕЦЦА З ЛЕНІНА»

— Міхаіл Васільевіч, якой бачылася перспектыва перабудовы вам асабіста?

— З пераходам на дэмакратычныя метады кіравання я прытрымліваўся той жа канцэпцыі, што і Рыжкоў. Гэта значыць, па-першае, выстройваць новыя звенні і сістэмы з выключэннем старых толькі тады, калі навінкі, што называецца, адпрацаваны. Але гарбачоўскае акружэнне, іх паслядоўнікі аддалі перавагу іншай методзе: разбурыць усё дашчэнту, а там хоць трава не расці! Планаванне высеклі, услед — сістэму дзяржаўнага забеспячэння... Выйшлі, праўда, на дагаворныя адносіны, але яны не адбыліся. У выніку рост дыспрапорцый. Пасля спланаванага пахавання арганізаванага цэнаўтварэння атрымалі інфляцыю, а цяпер і гіперінфляцыю — хто за гэта адкажа?

— А як, на вашу думку, трэба было распарадзіцца лёсам партыі?

— Апошні праект праграмы рыхтаваўся пры маім удзеле. Я стаяў на наступным: неабходна аднаўленне гістарычнай назвы — сацыялістычная партыя.

— Нават так, не сацыял-дэмакратычная?

— Сацыялістычная партыя працоўных. Хоць нічога дрэннага не бачу і ў памянёным вамі варыянце, што нагадвае першапачатковы мінскі—РСДРП. Больш таго, з улікам абвешчанага маральна-палітычнага адзінства народаў, партыя магла называцца народнай сацыялістычнай партыяй. Толькі не нацыянал-сацыялістычнай. Ідэалагізацыя назвы зусім не абавязковая. На жаль, мой варыянт не прынялі, хоць і давялося абмяркоўваць яго з членамі Палітбюро Фраловым і Дзасохавым.

Далей я лічыў неабходным рашуча змяніць усе парадкі ў партыі, ёй таксама трэба было стаць дэмакратычнай па сутнасці, самадзейнай па сутнасці. Па майму глыбокаму перакананню, тая ступень цэнтралізацыі, якая была закладзена Леніным у прынцыпе славутага дэмакратычнага цэнтралізму (у ідэале правільным), на практыцы ператварылася ў бюракратычны цэнтралізм, у падаўленне дэмакратычных самадзейных асноў.

Партыі патрабавалася таксама мець іншую структурную форму забеспячэння дэмакратыі. Я, напрыклад, лічыў вельмі добрай сістэму кіравання ў выглядзе саветаў сакратароў партыйных арганізацый як пастаяннага інстытута партыйнага кіраўніцтва на месцах. Ім — вырашаць усе справы, а органам, што стаяць вышэй, — прымаць выпрацаваныя там рэкамендацыі не проста да ведама, а да выканання. Умяшанне «вярхоў» пры такой сістэме магчымае толькі пры адной умове: калі прапануемыя прынцыповыя пазіцыі супярэчаць волі партыйнай большасці. Аднак і гэта «не» набывала б сілу толькі пасля дэталёвага абмеркавання пытання радавымі камуністамі, іх «так» на вета ЦК.

Адным словам, трэба было ператварыць партыю са строга арганізаванай і сапраўды адзяржаўленай партыі ў партыю сапраўды дэмакратычную. Бо яе абказёнілі, забюракратызавалі, задагматызавалі да немагчымасці. Сістэма аўтакратычнага кіраўніцтва была ў нас не толькі ў дзяржаве, але і ў партыі. Гэта склалася нават персаніфікацыяй. Хрушчоў, Брэжнеў, Андропаў, Чарненка і Гарбачоў — усе былі кіраўнікамі і КПСС, і вышэйшага дзяржаўнага органа. Ці ж не бязладдзе?

— А ці ўзнікала пры абмеркаванні праекта новай партыйнай праграмы ідэя партыі парламенцкага тыпу?

— Бачыце ў чым справа... Парламент, як вядома, ад слова «парле» — гаварыць. Таму, прымяняючы новую тэрміналогію, трэба абавязкова ўдумацца ў яе сутнасць. Мы ж пастаянна з'яўляемся сведкамі стэрэатыпаў зусім дзікіх. Адносіцца гэта і да прыведзенага вамі азначэння. Так, дзяржавай павінен кіраваць вярхоўны орган, які ўвасабляе калектыўны розум народа. Ці то парламент, ці Вярхоўны Савет, Дзяржаўная Дума — як пажадаеце. Магчыма, павінен быць і прэзідэнт, але, канешне, не цар і не манарх — тут ужо адкрытае глупства, і я ніколі не падтрымаю ні Салжаніцыных, ні Сабчакоў, ні некага яшчэ, хто мысліць у манархічным ключы. Хоць Салжаніцына лічу вельмі таленавітым пісьменнікам. Але як мысліцель ён зусім адарваны ад рэалій. Да таго ж, ён абсалютны рэакцыянер па перакананнях, няма чаго яго ідэалізаваць, добры гусь, чытаў я яго. Адзіная рэч, у якой ён узняўся вельмі высока, — гэта «Архіпелаг ГУЛАГ», тут свайго роду шэдэўр, неўміручы помнік эпохі. ГУЛАГам ён прадставіў свету ўсю нашу краіну, хоць такой яна не была.

Так, той перыяд быў страшны, ракавы для краіны. Але тым не менш і тады народ ствараў, працаваў. Індустрыялізацыя была праведзена, другая вугальна-металургічная база была створана, абаронную прамысловасць, авіяцыйную, машынабудаўнічую ўзнялі... Канешне, падаўленне свабоды грамадскай думкі ў наяўнасці. Панаваў нейкі зверскі дагматызм, страшэнны заціск грамадскай сферы... Але думку навукова-тэхнічную, там, дзе гэта патрабавалася краіне, Сталін не заціскаў. Нават калі ён пасадзіў Тупалева, дык пад расстрэл жа не аддаў... Хітры быў, каварны звер, нават не звер, а натуральны вурдалак. Але ў той жа час ён усведамляў, што, прама і груба здрадзіўшы гэтай краіне і гэтаму народу, ён прыкончыць тым самым і сябе...

Аляксандр УЛІЦЁНАК.

(Працяг будзе).

● «НЕБЫЛІЦА ПРА ІВАНА»
● «ДЗІКІ ПЛЯЖ»
● «МАЛПА, ЯКАЯ ГАВОРЫЦЬ»
● «СТУДЭНТКА»
● «ЗАЛАТАЯ ШПАГА»

Новую каляровую мастацкую кінастужку «НЕБЫЛІЦЫ ПРА ІВАНА» перадае на суд гледачоў Кіеўская кінастудыя імя А. П. Даўжэнкі.

Карціна нагадвае народны тэатр з традыцыйнымі персанажамі, з карагодамі, прымаўкамі, прыпеўкамі, з хітраватым высакародным героем, нарэшце. Хто ён? Яго клічуць Іванам Калітою. Гэта ці то злодзей, ці то бадзяга, ці то блазан... Ванда свайго гаспадара, вучоны быў вымушаны пачаць выхаванне нанава...

...Глядач напэўна ўжо запомніў імя французскага рэжысёра Клода Пінота пасля выхаду карцін «Бум» і «Бум-2». Запомніў і выканаўцу галоўнай ролі Сафі Марсо.

«СТУДЭНТКА» — яшчэ адна карціна К. Пінота, а ў галоўнай ролі тая ж Сафі Марсо. Гэта гісторыя пра тое, як пакахалі адзін аднаго сур'ёзная, строгая дзяўчына-студэнтка, што вывучае класічную літаратуру, і малады кампазітар, легкадумны, кампанейскі чалавек, які паспеў ужо зведаць спакусы і халастога, і сямейнага жыцця...

...Калісьці каралю маленькай чароўнай краіны вядзьмар прадказаў, што яго сын, калі вырасце, пакахае тую, якая жыве сярод людзей, і пойдзе да яе; на краіну ж пасыплюцца страшэнныя няшчасці, і яе жыхары, маленькія чалавечкі, што нагадваюць эльфаў, загінуць. Так і адбылося. Пра тое, як развіваліся падзеі далей, гледачы даведаюцца, паглядзеўшы новую каляровую мастацкую кінастужку «ЗАЛАТАЯ ШПАГА» вытворчасці кінастудыі «Масфільм».

НА ЗДЫМКУ: кадр з фільма «НЕБЫЛІЦЫ ПРА ІВАНА».

Фільмы тыдня

друе па горных карпацкіх дарогах, заступаецца за бедных і зняважаных, здзекуецца над дурнямі і багацеямі, лезе ўсюды, куды яго і не клічуць, і нават умудраюцца, пераапранёўшыся ў жаночае адзенне, паслужыць разам з дзяўчатамі-стралкамі ў арміі. Шматлікія прыгоды і штукарствы героя складаюць філасофскую канструкцыю, якая пацвярджае ўсё тое ж, што ва ўсе часы пацвярджала мастацтва: дабро і зло будуць вечна працягваць сваю сусветную спрэчку, і дабро ў рэшце рэшт абавязкова пераможа...

...На Кіеўскай кінастудыі імя А. П. Даўжэнкі створана таксама каляровая мастацкая кінастужка «ДЗІКІ ПЛЯЖ».

Дзеянне стужкі разгортваецца ў невялікім паўднёвым гарадку. На пустынным пляжы збіраецца кампанія маладых мужчын. Адзін з іх, Валодзя, прыводзіць сваю сяброўку Лену. Усе паступова напіваюцца, і звычайны пікнік ператвараецца ў п'яную оргію. Пазайздросціўшы Валодзю, які «прагуляўся» з Ленай у стэп, азвярэлыя ад пажадлівасці мужчыны кідаюцца на жанчыну і гвалтуюць яе. Зняважаная Лена спрабуе адпомсціць выладкам, сутыкаючы іх між сабой...

...На кінастудыі «Фенікс-фільм» пры ўдзеле «Масфільма» знята новая каляровая мастацкая кінастужка «МАЛПА, ЯКАЯ ГАВОРЫЦЬ».

Група злачынцаў вырашыла зарабляць грошы, выкарыстоўваючы моду на экзатычных жывёл. Гэтыя злыя і сквапныя людзі выкладаюць няшчасных звяроў у іх клапатлівых гаспадароў і перапрадаюць сваім багатым клієнтам. Ахвярай гэтага жорсткага «бізнесу» стаў і вучоны Іван Мішуткін, які шмат гадоў выхоўваў малпу. Ён навучыў яе многаму, нават размаўляць па-чалавечаму. Але, трапіўшы ў кампанію дрэнных людзей, малпа хутка пераняла іх звычкі. Калі ж пасля доўгіх перыпетый яна вярнулася

КРЫЖАВАНКА «АНАГРАМЫ»

З кожнага слова-загадкі, пераставіўшы ў ім літары, можна атрымаць новае слова — анаграму. Адгадайце наступныя анаграмы і запішыце іх ў клеткі крыжаванкі.

Па гарызанталях: 5. Астра. 7. Балака. 8. Танкер. 11. Крысо. 13. Казачка. 15. Аброк. 16. Зруб. 17. Гуаш. 21. Самакат. 23. Заранак. 24. Кантата. 25. Пірат. 26. Кірунак. 29. Рагатка. 31. Гармата. 34. Атол. 36. Корт. 38. Топка. 39. Гаркота. 42. Аўрал. 43. Зварот. 44. Кратэр. 45. Пілка.

Па вертыкалях: 1. Паста. 2. Спарта. 3. Донар. 4. Змора. 6. Горан. 9. Дышаль. 10. Храпка. 12. Бук. 13. Раска. 14. Ранак. 15. Тук. 18. Гарачка. 19. Капітан. 20. Мазут. 22. Чарка. 27. Валока. 28. Горкі. 29. Казак. 30. Алегра. 32. Акт. 33. Лот. 34. Слота. 35. Кольца. 37. Варта. 40. Базар. 41. Карат.

Склаў Рыгор ЯКУШ.
г. Мінск.



Адказы на крыжаванку, змешчаную 25 ліпеня



РАСЛІНЫ І ЗДАРОЎЕ

МАРКОЎНІК ЛЯСНЫ

На Беларусі расце на ўзлесках, каля платоў, уздоўж дарог, у садах, парках, на пойменных лугах.

Шматгадовая травяністая расліна вышынёй да 1,5 м. Сцябло дудкавае, рабрыстае, апушанае. Лісце двойчы- і тройчыпёрыстарассечанае, адрастае вясной ад зімовага кораня, буйное, апушанае, пры расціранні мае прыемны пах.

Цвіце ў чэрвені — ліпені. Кветкі дробныя, несамавітыя, сабраныя ў складаныя парасонавыя суквецці. Плады падоўжаныя, 6—7 мм.

У траве ўтрымліваюцца вітаміны С, B_1, крухмал, фруктоза, цукроза, бялкі.

Добры меданос.

У ГАСПАДАРЦЫ

з травы атрымліваюць жоўты фарбавальнік розных адценняў для шэрсці.

ПРЫ ХАРЧАВАННІ

выкарыстоўваюць далікатныя мясістыя сцяблы і маладое лісце. З іх гатуюць салаты, супы, гарніры. Іх марынуюць, квасяць на зіму. Ачышчаныя ад лупінаў ядуць сырымі.

САЛАТ З МАРКОЎНІКУ. Маладое лісце і сцяблы старанна прамыць халоднай вадой, парэзаць, дабавіць здробненае лісце шчаўя, зялёную цыбулю, пасаліць, заправіць маянэзам або смятанай, алеем.

150—200 г маркоўніку, 25 г шчаўя, 25 г зялёнай цыбулі, 25 г маянэзу (або смятаны, або алею), соль па смаку.

САЛАТА З МАРКОЎНІКУ І СНІТКІ. Зяленіва маркоўніку, лісце сніткі парэзаць, дабавіць здробненую зялёную цыбулю, перацерці з соллю. Сок зліць. Салату заправіць маянэзам або смятанай, алеем.

150 г маркоўніку, 50 г сніткі, 25 г зялёнай цыбулі, 25 г маянэзу (або смятаны, або алею), соль па смаку.

КАПУСТА З МАРКОЎНІКАМ. У падсоленай вадзе ці мясным булёне зварыць парэзаную бульбу, моркву, дабавіць пасечаную цыбулю, здробненыя маркоўнік, шчаўе, капусту, давесці да кіпення. Перад падачай на стол заправіць крута зваранымі яйкамі і смятанай.

500 мл булёну, 100 г бульбы, 30 г морквы, 25 г цыбулі рэпчатай, 100 г маркоўніку, 50 г шчаўя, 100 г капусты, 25 г смятаны, 1/2 яйка, соль.

ПЮРЭ З МАРКОЎНІКУ. Лісце і сцяблы пабланшаваць 2—3 хвіліны, прапусціць праз мясарубку, заправіць смятанай, маслам ці алеем. Падаць як самастойную страву ці ў якасці гарніру да мясных, рыбных страў.

100 г маркоўніку, 25 г смятаны, 25 г масла ці алею.

МАРЫНАВАНАЕ ЗЯЛЕНІВА МАРКОЎНІКУ. Маладое лісце і сцяблы пабланшаваць 1—2 хвіліны, раскласці ў стэрылізаваныя слоікі, заліць марынадам, накрыць накрыўкамі і пастэрызаваць (паўлітровыя слоікі 15, літровыя 20 хвілін), закупорыць. Захоўваць у халаднаватым месцы. Выкарыстоўваць як гарнір ці закуску.

ДЛЯ МАРЫНАДУ: 1 л кіпеню, 2—3 лаўровыя лісты, 1 дэсертная лыжка воцату, перац духмяны, соль па смаку.

КВАШАНАЕ ЗЯЛЕНІВА МАРКОЎНІКУ. Лісце і сцяблы маркоўніку прамыць халоднай вадой, адкінуць на друшляк. Калі вада сцячэ, перэсыпаць, пасаліць, скласці ў эмаліраваную пасудзіну, прыціснуць грузам. Дабаўляць у баршчы, выкарыстоўваць як самастойную страву і як гарнір.

1 кг маркоўніку, 100 г солі.

У НАРОДНАЙ МЕДЫЦЫНЕ

ўжываюць свежае, старанна прамытае халоднай вадой лісце. Яго прыкладваюць да апёкаў, фурункулаў, карбункулаў.

Проціпаказанні не ўстаноўлены.

НАРЫХТОЎВАЮЦЬ

маладое лісце і сцяблы маркоўніку да пачатку цвіцення.

Ніна АЛЯКСЕЙЧЫК, Валер САНЬКО.

БЕЛАРУСКА-ЛАТВІЙСКАЯ ПКФ

„ЛІДЗІЯ"

прапануе і рэалізуе
па цэнах ніжэй рыначных станкі:

ВІБРАПРЭС ВІП-9:

■ **150 ТРАТУАРНЫХ АБО АБЛІЦОВАЧНЫХ ПЛІТАК за гадзіну і 1.000 штук за змену.**

● **РАЗМЕРЫ тратуарнай плітки 300Х300Х80.**

● **РАЗМЕРЫ абліцовачнай плітки — 300Х300Х30 мм.**

● **ПОЎНАСЦЮ ВЫКЛЮЧАЕЦЦА прапарка і сушка, цана за адзін станок — 55.000 (б/нал).**

ВІБРАСТАНОК ВС-01:

● **4 СЦЕНАВЫЯ БЛОКІ адначасова і 1.000 штук за змену.**

● **РАЗМЕРЫ блока — 380Х190Х190 мм.**

● **ВЫКАРЫСТОЎВАЕМЫЯ Ў СТАНКУ вібратары тыпу ІВ-98 (ИВ-104) дазваляюць атрымаць сценавыя блокі шчыльнасцю да 168 кг/см².**

● **ПОЎНАСЦЮ ВЫКЛЮЧАЕЦЦА прапарка і сушка.**

● **ЦАНА ЗА АДЗІН СТАНОК — 22.000 тысячы рублёў (б/наяўн) або 20.000 тысяч рублёў (наяўн.).**

Прапануем таксама АЦЫНКАВАНАЕ ЖАЛЕЗА па цане 41.000 рублёў за тону па безнаяўнаму разліку і разцы з пласцінамі са сплаву ТН-20.

Пласціны ТН-20 маюць выдатныя фізіка-механічныя ўласцівасці і вырабляюцца па тэхналогіі завода-вытворцы. Іх мяжа пругкасці на згіб 1050 Н/мм², цвёрдасць NRA>90, дапушчальная скорасць рэзання да 250 М/мін. ТН-20 — гэта гарантыя эфектыўнай апрацоўкі вугляродзістых канструкцыйных сталяў, каляровых металаў, сплаваў нікелю, чыгуну, і нават поліэтылену.

НАБЫВАЙЦЕ Ў НАС:

РАЗЦЫ ТАКАРНЫЯ ПРАХАДНЫЯ ЎПОРНЫЯ 0057ТН-20, 0007ТН-20, АДРАЗНЫЯ 0009ТН-20.

Кошт такарных разцоў 22 рублі за штуку, мінімальная партыя ў кантэйнеры 2.000 штук.

Чакаем у Лідзе вашых званкоў па тэлефонах: 2-73-21 — удзень, 3-44-37 — удзень і ўвечары, 2-03-90 — увечары.

НА ДВОР'Е

1 жніўня

Сёння ўдзень па рэспубліцы пераменная воблачнасць, па поўдню месцамі кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ў Гродна, Віцебску і Магілёве — 21—23, у Мінску — 22—24, Гомелі — 23—25, Брэсце — 24—26 градусаў цяпла. У наступныя двое сутак месцамі кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра 2 жніўня ўначы 8—13, удзень 22—27, 3-га ўначы 10—15, удзень — 19—24 градусы цяпла.

Л. САНКЕВІЧ, інжынер-сіноптык.

СУБОТНІМ ВЕЧАРАМ

АДКАЗЫ І РАШЭННІ

Крыптаграма (25 ліпеня). «Ахоўваць прыроду — гэта значыць ахоўваць радзіму» — такое выказванне было зашыфравана ў крыптаграме. Першымі правільныя рашэнні дасылалі Іван Кожух з Брэста і мінчанін Аляксандр Паўловіч.

СТРАЛЬБА ПА МІШЭНІ

На спаборніцтвах па стральбе спартсмен пасля шасці выстраляў набраў 96 ачкоў. Праверка мішэні паказала, што ў ёй ёсць толькі тры адтуліны. Але было ўстаноўлена, што ў некаторыя адтуліны кулі папалі больш аднаго раза.

Вызначце, якія пападанні маглі набраць у суме 96 ачкоў...

РАЙЦЭНТРЫ — САМЫЯ. САМЫЯ...

Камянецкі, Верхнядзвінскі, Хоцімскі і Брагінскі раёны — самыя-самыя, адпаведна, заходні, паўночны, усходні і паўднёвы раёны Беларусі. А раённыя цэнтры? Паспрабуйце, не зазірнуўшы ў геаграфічную карту, ўспомніць гэта. А потым праверце сябе па карце...

ШТО ТАКОЕ «ЭНДУРА»?

Гэта матацыкл (а дакладней — катэгорыя матацыклаў), прызначаны для язды па палявых, прасёлкавых, лясных дарогах. Ім карыстаюцца вясковцы, паляўнічыя, леснікі, турысты і г. д. «Эндура» ў перакладзе на родную мову азначае «выносліва».

Іспанскае паходжанне гэтага слова тлумачыцца тым, што матацыклы гэтай катэгорыі ўпершыню пачалі выпускаць іспанскія матацыклетныя заводы «Бультака», «Мантэса», «Оса». Гэта было недзе ў 70-я гады.

Сярод вядомых нам машын да класа «эндура» адносяцца славутыя «ІЖ-64М», некаторыя варыянты матацыклаў «Сузукі», «Ямаха», «Хонда», «БМВ»...

ТЭЛЕБАЧАННЕ

2 жніўня

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. «Тэмы для розуму». Фільм-канцэрт.
9.50. «Дон Сезар дэ Базан». Маст. фільм. 2-я серыя.
10.55. Дак. фільм «Мастак з Кунгура».
11.10. «Лявоніха». Тэленарыс пра партызанскую сувязную М. Г. Сувалаву.
11.35. Іграе Генадзь Забара (кларнет).
12.35. «Не жадай зла, злом павернецца».
13.00. НІКа.
14.45. Конны спорт.
14.30. Мультфільмы.
14.45. Кінаэкран-92. Жнівень.
16.10. «Сёння і штодзень». Тэлефільм.
17.10. Творчы партрэт Алеся Звонака.
17.35. «Любоўю і ісцінай выратуемся». Канцэртная праграма з вечара беларускай і амерыканскай грамадскасці. Частка 2-я.
19.05. Архіварыус. «Па лесвіцы часу да горных вяршынь».
20.00. Панарама.
20.25. «Цудоўны Гоша». Мультфільм для дарослых. Часткі 3, 4, 5.
20.40. Калыханка.
21.00. «Сінема» прадстаўляе: маст. фільм «Тысяча мільярдаў долараў» (Францыя). 2-я серыя.
22.10. Існасць. Духоўна-рэлігійная праграма.

І канал. Астанкіна

6.00. Гадзіна сілы духу.
7.00. На XXV летніх Алімпійскіх гульнях.
7.45. Тыраж «Спортлато».
8.00. Раным-рана.
8.40. Магчыма ўсё.
9.10. Ранішняя зорка.
10.00. Дак. фільм «Серафім Сароўскі. Вяртанне».
10.50. XXV летнія Алімпійскія гульні.
12.30. «Вясёлка». «Ямайка сёння».
12.55. Кінаафіша.
13.10. «Запаведнікі дзікай прыроды». Фільм 10-ы.
13.35. Маст. фільм «Марк і Сафі». Фільм 10-ы.
14.00. Навіны (з сурдаперакладам).
14.20. XXV летнія Алімпійскія гульні.
15.30. Клуб падарожнікаў.
16.15. «Панарама».
16.55. Уолт Дысней прадстаўляе...
17.45. Навіны.
18.00. Дак. фільм «Рускае шчасце».
19.00. «Выкраданне Празерпіны» з крымінальнага серыяла «Паляўнічыя на шэдэўры» (Італія).
20.00. Вынікі.
20.45. XXV летнія Алімпійскія гульні. У перапынку **(23.00)** — Навіны.

Канал «Расія»

9.00. «Суперкніга». 23-я серыя.
9.25. Аты-баты...
9.55. XXV летнія Алімпійскія гульні. Веласпорт. Лёгкая атлетыка. Валейбол. Тэніс. У перапынку **(12.55)** — Спорт-шоу. Весткі.
15.20. Тэлевізійны тэатр Расіі. Бенефіс Н. Касаткінай і В. Васільева.
16.25. Зігзаг удачы. Тэлевікторына.
17.05. «Незнаёмы Буркоў. Пісьмы да сябра».
17.55. Мастацтва адлюстравання. Вечар у Сакольніках з Сяргеем Шаровым.
18.25. Музычная вёска.
19.00. Весткі.
19.20. Свята кожнага дзень.
19.30. Спявае Ларыса Трухіна.
20.25. Музыка ў стылі «пепсі».
22.00. Весткі.
22.20. Спорт-шоу.
22.25. XXV летнія Алімпійскія гульні. Дзюдо. Лёгкая атлетыка. Плаванне. Баскетбол (мужчыны).

РАДЫЁ

2 жніўня

Апошнія паведамленні: 6.00, 7.50, 15.00, 19.45, 23.00.

6.15 —канцэрт для працаўнікоў вёскі. 7.20 — «Добры настрой». Канцэрт. 7.35 — «Дзесяць хвілін сацыёлага». 8.00 —вершы П. Панчанкі. 8.40 — запісы маладога беларускага спевака У. Крывенкі. 9.15 — «Смяюцца —не грэх». Гумарыстычная перадача. 10.00— «Жадаю Вам...». Канцэрт-віншаванне. 11.00 —«У эфіры — Магілёў». Публіцыстычная праграма. 11.30 — «У вольную часіну». Музычная праграма. 12.00 — «Перакананць сябе». 12.20 — «Прагрэс». Весткі з рэспубліканскай Акадэміі навук. 13.00 — праграма для вайскоўцаў «Паходня». 14.00— «Чалавек сярод людзей». 15.15 —«Вяртанне да вытокаў». 15.30 — «Добрага вам здароўя». Радыёчасопіс. 16.05 — «Крэсла для госця». 16.30 — «Поўны каданс». Музычная праграма для падлеткаў. 17.00 — «Наш жнівеньскі каляндар». 18.00 — «Дудка беларуская». Праграма духоўнага адраджэння. 18.40 — «Рэха Віцебскага фестывалю». Музычная праграма. 19.45 — «Дзень нашага жыцця». 20.05 — вячэрняя казка. 20.20 — канцэрт. 20.30 — «Вячэрнія зарніцы». 21.00 — на атрыманне Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь. А. Звонак. «Святлацені». Кніга паэзіі. 21.30 — «Мы павінны жыць багата». Нататкі пісьменніка В. Дайліды. 22.00 — М. Ракітны. «Двое». Інсцэніраванае апавяданне. 23.10 — «Музычная хваля». 0.00 — «Начны канал».